Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

14 ЖНІЎНЯ 2009 г.
ПЯТНІЦА
№ 151
(26509)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Уладзімір ГРАКУН, начальнік галоўнага ўпраўлення раслінаводства Мінсельгасхарча:

«ЁСЦЬ 6 МІЛЬЁНАЎ ТОН ЗБОЖЖА. А ЎСЯГО ПАВІННА БЫЦЬ БОЛЬШ ЧЫМ 8 МЛН»

З-за дажджоў тэрміны ўборкі могуць павялічыцца, наколькі — вядома, пакажа час. Як адзначыў начальнік галоўнага ўпраўлення раслінаводства Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Уладзімір Гракун, калі пачыналася жніво, то меркавалася, што яно завершыцца ўжо да 20 жніўня. «Мы апасаемся, што надвор'е ўсё ж умяшаецца ў планы аграрыяў, — заўважыў спецыяліст Мінсельгасхарча. — Аднак застаюцца спадзяванні на тое, што адрыў будзе не такі значны. Інакш не пазбегнуць страт збожжа».

З-за складаных умоў камбайны абсталююць спаранымі коламі (каб павялічыць праходнасць), плошчы ўбіраюцца выбарачна. Як адзначыў намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення механізацыі і тэхнічнага прагрэсу Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Уладзімір Кулька, гэты год яшчэ раз паказаў, што канструктарам неабходна інтэнсіўна працаваць над павышэннем праходнасці тэхнікі. Каб павялічыць гэтую характарыстыку, на месцах прымяняюцца разнастайныя метады. Аднак гэтага недастаткова. На палетках працуюць 12 тысяч камбайнаў, з іх каля 10 тыс. — на жніве, а астатнія займаюцца нарыхтоўкай кармоў. У сярэднім нагрузка на камбайн складае 195 гектараў. Самы вялікі паказчык у Гомельскай вобласці — 225 га, найменшыя на Віцебшчыне і Гродзеншчыне — па 187 га.

У асноўным апошнім часам рабілася стаўка на набыццё айчыннай тэхнікі. Аднак, адзначыў Уладзімір Кулька, у камбайнаў беларускай вытворчасці самая высокая прапускная здольнасць складае 12 кілаграмаў збожжа за секунду. «Гомсельмаш» выпускаўся невялікую партыю (10 машын), якія ўбіраюць з «хуткасцю» 14 кг/с. Таму, калі закуплялася замежная тэхніка, то з прадукцыйнасцю большай за гэты паказчык.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

ЧАТЫРЫ КАПІТАНКІ

Агратурызм у вёсцы Язна ў надзейных жаночых руках

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Для турызму ў нашай вёсцы ёсць усё: азёры, лес, крыніца, — вырашылі дзве школьныя настаўніцы, бібліятэкар і работнік культуры і зарэгістравалі аграсядзібы. У возеры чыстая вада і шмат рыбы, у лесе — грыбы і ягады, а крыніца асвечана ў гонар Яна Хрысціцеля і вабіць сваёй сакральнасцю. Ёсць яшчэ і балота «Жады» для аматараў журавінаў. **Тамара КАСАТАЯ** — гаспадыня сядзібы «Клённая», **Лілія СПІРКОВІЧ** — «Клубнічнай», **Ларыса БЕРВЯЧОНАК** назвала «Язынкай», а **Наталля ЖОУДЗІК** — «Белымі росамі». Толькі тры гады як узяліся яны за новую для вёскі справу. Тэрмін невялікі, але дастатковы, каб адчуць, што адпачынак у Язне — рэч нядрэнная. Гасцявалі тут нават шведы, французы і галандцы. Яшчэ гаспадынь аграсядзібаў аб'яднуўае песня.

Міёрскі раён.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

Беларусь па-ранейшаму застаецца адзіным надзейным стратэгічным саюзнікам Расіі

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 13 жніўня даў інтэрв'ю тэлепраграме «Формула ўлады» — сумеснаму праекту расійскага інфармацыйнага агенцтва ІТАР—ТАСС і тэлеканала «Расія».

Ацэньваючы сучасны стан беларуска-расійскіх адносінаў, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Беларусь па-ранейшаму застаецца надзейным саюзнікам Расіі. Аднак ён са шкадаваннем канстатаваў, што ў Расіі няма аб'ектыўнай карціны таго, што адбываецца ў Беларусі.

«Палітычная эліта Расіі абсалютна не ведае, што адбываецца ў Беларусі. Вось яны прачытаюць у гадкіх газетах, дзе заказных артыкулаў хапае, дзе многія ненавідзяць Беларусь, і гавораць, што Беларусь пайшла на Захад, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Дык вы ж разбярыцеся па афіцыйных каналах, вы ў мяне спытайце, куды мы пайшлі: на Захад, на Усход... Яны не ведаюць, што адбываецца тут».

Прэзідэнт таксама адзначыў, што не разумее насцярожанасці ў Расіі наконт таго, што Беларусь апошнім часам выбудоўвае адносіны з Еўропай. «Чаму кіраўніцтва Расіі так страшна ўспрымае, што мы пачалі размову з Еўропай?» — спытаў кіраўнік беларускай дзяржавы. «Мы 45 працэнтаў гандлюем з Еўропай — мільярды долараў. Я павінен гэта палітычна забяспечваць? Мы ж адмахнуцца ад гэтага не можам. Таму я забяспечваю ў знешняй палітыцы, дыпламатычна, нашы эканамічныя інтарэсы», — сказаў Прэзідэнт. «Помніце, што адзіны надзейны саюзнік у вас застаўся — гэта Беларусь, стратэгічны саюзнік на стратэгічным напрамку. Так было заўсёды», — заявіў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Перадача выходзіць у эфір з 2000 года. За гэты час было знята больш як 150 праграм, сярод якіх тэлепартрэты прэзідэнтаў ЗША Джорджа Буша і Барака Абамы, федэральных канцлераў Германіі Герхарда Шродэра і Ангелы Меркель, прэзідэнта Францыі Жака Шырака, караля Швецыі Карла XVI Густава, караля Іспаніі Хуана Карласа, каралевы Даніі Маргрэтэ II, прэм'ер-міністра Італіі Сільвіо Берлусконі, амаль усіх кіраўнікоў краін СНД і іншых лідараў дзяржаў.

Тэлеверсія гутаркі будзе паказана 29 жніўня ў вячэрнім эфіры тэлеканала «Расія».

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ДЫПЛОМ — ЗА ГРОШЫ

Задача максімум для кожнага абітурыента — паступіць у ВНУ на «бюджэт», задача мінімум — стаць студэнтам платнай формы навучання, якая застаецца для многіх страховачным варыянтам. У апошнія гады трэба вельмі пастарацца для таго, каб стаць студэнтам-платнікам. Напрыклад, у Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце пры паступленні на дзённую форму навучання на спецыяльнасць «фінансы і крэдыт у знешнеэканамічнай дзейнасці» прахаднымі сталі 282 балы, на спецыяльнасцях «кіраванне знешнеэканамічнай дзейнасцю» і «фінансы»— 275 балаў, на спецыяльнасцях «эканамічная палітыка» і «бізнэс-адміністрыраванне» — 268 балаў, «эканоміка і кіраванне гасцініцамі і рэстаранамі» — 269, «эканоміка і кіраванне турыстычнай дзейнасцю» — 267, «міжнародны маркетынг» — 265, «цэнаўтварэнне»і «рэкламная дзейнасць» — 264 і гэтак далей.

У залежнасці ад паспяховасці студэнта памер зніжак з кошту навучання можа складаць:
пры сярэднім бале ад 7,46 да 8,25 — 20 працэнтаў;
сярэднім бале ад 8,25 да 9,0 — 40 працэнтаў;
пры сярэднім бале звыш 9,0 — 60 працэнтаў.

У Беларускім дзяржаўным медыцынскім універсітэце для паступлення на платную форму навучання на лячэбны факультэт трэба было мець у багажы 273 балы. У БДУ на дзённай платнай форме навучання пропускам на спецыяльнасць «міжнароднае права» сталі 299 (!) балаў, «лінгвакраіназнаўства» і «міжнародныя адносіны»— 293 балы, «сусветная эканоміка» і «менеджмент у сферы міжнароднага турызму» — 276, «бізнэс-адміністрыраванне» — 250 балаў, «міжнародная журналістыка» — 24,2, «дызайн» на гуманітарным факультэце — 25,5 бала і «дызайн» у Дзяржаўным інстытуце кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ — 26,7 бала. У БНТУ ахвотнікі асвойваць «мытную справу» на платнай аснове павінны былі набраць 247 балаў, «бізнэс-адміністрыраванне» — 248, « эканоміку і арганізацыю вытворчасці» на аўтатрактарным факультэце — 237, «менеджмент» на факультэце тэхналогій кіравання і гуманітарызацыі — 234 балы і гэтак далей.

Адным словам, нягледзячы на сусветны фінансавы крызіс, колькасць ахвотных укладваць свае грошы ў адукацыю не зменшылася. Традыцыйна самай дарагой, прычым не толькі ў нас, але і ва ўсім свеце, з'яўляецца вышэйшая медыцынская адукацыя. Напрыклад, студэнт-першакурснік Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, які вучыцца на стаматолага, павінен будзе ўнесці за сваё навучанне суму, роўную 6 мільёнам. Для будучых педыятраў і студэнтаў лячэбнага факультэта кошт навучання складзе 4 млн 980 тысяч рублёў, а для студэнтаў медыка-прафілактычнага факультэта — 4 млн 440 тысяч рублёў. У Віцебскім медуніверсітэце вучоба на стаматолага абыдзецца ў 5 млн 680 тысяч рублёў за адзін навучальны год, на спецыяльнасці «фармацыя» кошт навучання складае 4 млн 900 тысяч рублёў на дзённай і 2 мільёны рублёў — на завочнай форме навучання. У Гродзенскім медуніверсітэце навучанне на лячэбным факультэце амаль што на 400 тысяч рублёў таннейшае, чым у Мінску, а самымі «таннымі» спецыяльнасцямі тут з'яўляюцца «медыка-дыягнастычная справа» (3 млн 740 тысяч рублёў) і «сястрынская справа» — 4 млн 50 тысяч рублёў.

У БДУ на звышпрэстыжных спецыяльнасцях факультэта міжнародных адносінаў і юрыдычнага факультэта плата за навучанне складае 4 млн 716 тысяч 500 рублёў. Тым не менш недахопу ў ахвотных не назіраецца. Дзіўна, але, напрыклад, спецыяльнасць «дакументазнаўства» на гістарычным факультэце ацэненая кіраўніцтвам універсітэта даражэй, чым спецыяльнасць «камп'ютарная бяспека»: у першым выпадку кошт навучання складае 4 млн 219 тысяч 900 рублёў, а ў другім — 3 млн 813 тысяч 900 рублёў адпаведна. У Інстытуце журналістыкі «міжнародная журналістыка» «каштуе» на паўмільёна рублёў у год больш за «звычайную» журналістыку .

У Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце для першакурснікаў дзённай формы навучання плата складзе 3 млн 528 тысяч рублёў незалежна ад спецыяльнасці. Самымі дарагімі факультэтамі для першакурснікаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі будуць факультэты інфармацыйных тэхналогій і кіравання і факультэт камп'ютарных сістэм і сетак (кошт навучання — 3 млн 800 тысяч рублёў), а самым танным на дзённай форме навучання — факультэт радыётэхнікі і электронікі (3 млн 200 тысяч рублёў). У Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце памер платы вар'іруецца ад 3 млн 276 тысяч 980 рублёў да 3 млн 379 тысяч 380 рублёў. У Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце — ад 3 млн 424 тысяч да 3 млн 629 тысяч рублёў.

Значна меншай папулярнасцю ў моладзі карыстаюцца сельскагаспадарчыя спецыяльнасці. Ці не таму і кошт навучання ў профільных ВНУ не так «кусаецца». Так, у Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі плата за навучанне складае 2 млн 224 тысячы рублёў незалежна ад спецыяльнасці. У Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны «заатэхнія» «каштуе» 1 млн 954 тысяч рублёў, «ветэрынарная медыцына» — 2 млн 244 тысячы рублёў, «ветэрынарная фармацыя» і «ветэрынарная санітарыя і экспертыза» — 2 млн 714 тысяч рублёў. Самы высокі кошт тут на спецыялізацыі «хваробы парсюкоў» — 2 млн 814 тысяч 600 рублёў...

А цяпер пра тое, на што можа разлічваць студэнт-платнік. Калі ён будзе добра вучыцца, займацца навукова-даследчай дзейнасцю і мець актыўную грамадскую пазіцыю, то праз год зможа прэтэндаваць на атрыманне зніжак за навучанне. Канкрэтны памер зніжак студэнтам і навучэнцам залежыць ад сярэдняга бала паспяховасці па выніках за папярэдні навучальны год, але ён не можа перавышаць 60 працэнтаў ад сфарміраванага кошту навучання. Пры сярэднім бале паспяховасці больш як 9 балаў памер зніжкі будзе складаць 60 працэнтаў ад сфарміраванага кошту навучання, ад 8,25 да 9,0 — 40 працэнтаў і ад 7,46 да 8,25 — 20 працэнтаў. Пэўная частка студэнтаў можа прэтэндаваць на зніжэнне платы за навучанне, так бы мовіць, па сацыяльных крытэрыях (сіроты, інваліды і г.д). Ім зніжкі прадастаўляюцца пры ўмове атрымання на ўсіх прадметах адзнак не ніжэй за шэсць балаў, уключаючы вынікі здачы экзаменаў, залікаў, курсавых работ, праектаў, усіх відаў практыкі і дысцыплін, не вынесеных на экзаменацыйную сесію. Зніжкі для гэтай катэгорыі студэнтаў складаюць 40 працэнтаў ад сфарміраванага кошту навучання. Можна, вядома ж, спадзявацца і на перавод на бюджэтную форму навучання, але на практыцы гэта намнога менш рэалістычны варыянт, чым змяншэнне платы за навучанне ў якасці ўзнагароды за паспяховую вучобу.

Для сем'яў са сціплым сямейным бюджэтам ёсць яшчэ адно выйсце — яны могуць скарыстацца льготным крэдытам на навучанне ад «Беларусбанка». Але прэтэндаваць на адкрыццё льготнай крэдытнай лініі могуць толькі маладыя людзі, якія атрымліваюць першую вышэйшую адукацыю ў дзяржаўных вышэйшых або сярэдніх спецыяльных навучальных установах. Крэдыт можа афармляцца як на студэнта, так і на яго бацькоў. Праўда, устаноўлена своеасаблівая мяжа даходаў крэдытаатрымальніка: сярэднямесячны сукупны даход на кожнага члена сям'і за папярэдні год не павінен перавышаць 350 працэнтаў зацверджанага бюджэту пражыткавага мінімуму, які дзейнічае на дату адкрыцця крэдытнай лініі. Больш забяспечаныя грамадзяне разлічваць на атрыманне ў банку льготнага крэдыту, на жаль, не змогуць. Давядзецца браць крэдыт пад больш высокія працэнты, а льготны крэдыт выдаецца пад 1/2 стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка. Памер крэдыту вызначаецца штогадова, зыходзячы з кошту навучання, але максімальны памер кожнай часткі крэдыту не можа перавышаць 70 працэнтаў ад кошту навучання за адзін навучальны год. Вяртанне крэдыту пачынаецца з наступнага месяца пасля заканчэння навучальнай установы. На вяртанне крэдыту адводзіцца пяцігадовы тэрмін з моманту атрымання дыплома. Аднак яшчэ на працягу навучання крэдытаатрымальнік павінен штомесяц выплачваць банку працэнты за карыстанне крэдытам. У выпадку адлічэння з навучальнай установы студэнта, які вучыцца на платнай аснове, крэдытаатрымальнік павінен будзе вярнуць банку грошы з выплатай працэнтаў за карыстанне крэдытам у памеры стаўкі рэфінансавання не пазней чым праз 12 месяцаў пасля адлічэння. Аднак на тых, хто бярэ акадэмічны водпуск, гэты парадак не распаўсюджваецца. Пры прадастаўленні студэнту акадэмічнага водпуску, пераводзе яго на завочную, вячэрнюю формы навучання ці з платнай формы навучання на бюджэтную, крэдытаатрымальніку даецца права на вяртанне крэдыту на працягу пяці гадоў, а адлік распачынаецца з наступнага месяца пасля заканчэння навучальнай установы.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Зваротная сувязь

ХРАНІЧНЫ РАМОНТ

Храм у вёсцы Лясная Слаўгарадскага раёна рамантуюць шмат гадоў і ніяк не давядуць да ладу

У карэспандэнцкі пункт «Звязды» ў Магілёўскай вобласці звярнуўся настаяцель Свята-Пятра-Паўлаўскай царквы айцец Георгій Сакалоў. Святар папрасіў рэдакцыю дапамагчы ў навядзенні парадку ў будынку храма.

Справа ў тым, што летась знакамітую царкву, пабудаваную сто гадоў таму ў гонар юбілею перамогі рускіх войскаў над шведамі ў час Паўночнай вайны, капітальна адрэстаўравалі. Абноўлены хрампомнік стаў цэнтрам святкавання ўвосень 2008 года 300-годдзя бітвы пад Лясной. Аднак свята скончылася, а ў будынку царквы неўзабаве выявіліся хібы. Работы па іх ліквідацыі ідуць павольна, а якасць таго, што робіцца, выклікае ў настаяцеля вялікія сумненні.



Вынікам журналісцкага запыту стала сустрэча зацікаўленых бакоў на месцы — у храме ў вёсцы Лясная. Для таго, каб убачыць хібы, не трэба быць вялікім спецыялістам: рыжыя падцёкі на скляпеннях, цёмная цвіль на сценках і нават нешта накшталт белай снежнай ваты, якую будаўнікі вызначаюць як выступанне солі.

Прычына ў тым, што за савецкім часам храм пераўтварылі ў калгасны склад. Царква шмат гадоў не аціяплялася, дах працякаў, водаадводныя канструкцыі парушаны.

Цяпер рэстаўратарам і будаўнікам даводзіцца змагацца з хранічнай сырасцю сцен і яе наступствамі. І хібы, якія выявіліся праз нейкі час пасля рамонту, былі, у прынцыпе, чаканымі.

— Цяпер праектная арганізацыя дала свае рэкамендацыі ўжыць прэпарат, які прадухіліць з'яўленне грыбка ў сувязі з замаканнем сцен, — каментуе **Наталля КУЗНЯЦОВА, дырэктар магілёўскага прадпрыемства «Цэнтр па рэстаўрацыі»**, які з'яўляецца заказчыкам работ у Лясянскай царкве.

— Тут стагоддзе ўсё цякло, сцены тоўстыя і вільготныя, — сумняваецца **намеснік дырэктара прадпрыемства «Крыстмас плюс» Канстанцін СІЛЬВАНЬКОЎ.** — Я мяркую, што паводле якой тэхналогіі тут ні рабі, але праз год, два ці пяць усё вернецца.

Прадстаўніку субпадраднай арганізацыі не падабаецца неабходнасць выпраўляць хібы за ўласныя сродкі. Але ўсё ж гарантыйны тэрмін у 2 гады абавязвае.

Ды і прычына тут, лічаць у Цэнтры па рэстаўрацыі, не толькі ў аб'ектыўнай сырасці. Ёсць праблемы і з якасцю работ: прама ў храме намеснік дырэктара Цэнтра па рэстаўрацыі Вера Баксан вымушана была рабіць заўвагу будаўнікам, якія фарбавалі скляпенні, і звяртаць увагу на іх няправільныя дзеянні. Прараба, які б кіраваў рабочымі, на пляцоўцы не было.

Прэтэнзіі іншага кшталту выказаў да рабочых і святар: па яго словах, будаўнікі павінны разумець, што яны працуюць у дзейнай царкве, а таму гучная (і зусім не духоўная) музыка, рэаапрананне ў спяцоўкі перад алтаром, курэнне цыгарэт і іншае падобнае тут недарэчы.

Заказчыку, Цэнтру па рэстаўрацыі, увогуле не вельмі падабаецца стаўленне да працы ў Лясной генеральнага падрадчыка — ТАА «Жан». Яго **дырэктар Валянцін СВІРЫДАЎ** прызнае віну за дэфекты, але часткова. Ён спасылаецца на сцісłыя тэрміны рамонту перад юбілеем: ён фактычна пачаўся, у красавіку, а ў верасні будынак трэба было здаваць!

Калі за тым часам спяшаліся, то цяпер будаўнікі яўна не адчуваюць недахопу часу. У храме на 12 жніўня працавалі толькі 4 рабочыя. Тэрмін ліквідацыі недахопаў спачатку быў вызначаны на 1 мая, цяпер — на 20 жніўня. Аднак такімі сіламі наўрад ці ўдасца паспець і да гэтай, ужо вельмі блізкай даты.

Тым не менш заказчык работ, генеральны падрадчык і субпадрадчык выказалі сваю поўную ўпэўненасць у паспяховым выкананні задачы. Для гэтага будаўнікі вырашылі павялічыць колькасць працаўнікоў на пляцоўцы.

Магчыма, будаўнікоў падштурхне пагроза **начальніка аддзела культуры Слаўгарадскага райвыканкама Марыі БАРАНАВАЙ** (а менавіта на балансе гэтай установы знаходзіцца храм у Лясной) падаць у суд на пачатку верасня, калі тэрміны ліквідацыі хібаў рэстаўрацыі будуць зноў парушаны. Гатова прыняць меры да генпадрадчыка ў выпадку зрываў і кіраўніцтва Цэнтра па рэстаўрацыі.

Дыскусія паміж будаўнікамі і айцом Георгіем была досыць эмацыйнай і ахоплівала шмат праблем: ад ключоў да дзвярэй да працы супрацьпажарнай сігналізацыі. Усе яны, наколькі можна было зразумець з выніковых каментараў удзельнікаў нарады, вырашальныя.

А вось як у далейшым быць з захаваннем гістарычнага будынка — гэта пакуль не вельмі зразумела. І гэта пры тым, што з 2000 па 2008 год на яго рамонт і рэстаўрацыю дзяржава выдаткавала амаль 2 мільярды рублёў.

Сапраўды, галоўны вораг храма-помніка — вялікая сырасць. Спецыялісты ў справе рэстаўрацыі лічаць, што гэту праблему паспяхова вырашыла б цэнтральнае ацяпленне. Аднак з яго ўстаноўкай загадзя не пагадзіліся ўтрымальнікі будынка: храм працуе не штодня, а ацяпленне ў халодны сезон — гэта вялікія грошы. З прычыны значных выдаткаў адхілены і электрычныя тэны, а з-за пажарнай бяспекі — печкі.

Цяпер па праекце ў Лясянскай царкве зроблены падлогі з ацяпленнем. Яны можа і не дадуць прымярзаць нагам вернікаў на службе ў халодным храме, але наўрад ці падсушаць сцены.

Таму пакуль Цэнтр па рэстаўрацыі парэкамендаваў айцу Георгію штодня адчыняць усе дзверы і добра праветрываць будынак. Па словах Наталлі Кузняцовай, падобная сітуацыя калісьці была ў Шклоўскай ратушы, але праветрыванне дало плён.

— Мы хочам, каб усё было добра: а калі нейкія хібы выявяцца зноў, то будзем выпраўляць, — запэўніла кіраўнік Цэнтра па рэстаўрацыі.

— Спадзяюся, што ўсё будзе зроблена належным чынам, — падвёў вынік настаяцель Свята-Пятра-Паўлаўскай царквы айцец Георгій. — Я веру і спадзяюся.

Ілона ІВАНОВА.

Слаўгарадскі раён.

***P.S.** Паводле звестак з вёскі Лясная, на наступны пасля нарады дзень у храме працавалі 6 чалавек. Гэта меней, чым абяцаў генеральны падрадчык, але ўжо болей, чым раней. Між тым, да 20 жніўня застаўся толькі тыдзень.*

ЗЯМЛЯ КОЛАСА

Ён марыў пра новую зямлю. Тады, на яго думку, новай павінна была быць і Беларусь. Пісьменнік, паэт, актыўны грамадскі дзеяч Якуб Колас жыў з думкамі пра Беларусь да апошняга дня. І памёр, як кажуць, за сваім рабочым сталом 13 жніўня 1956 года.

Зямля Коласа ўспамінала свайго класіка ў гэты дзень. У сярцы сталіцы, на плошчы, якая носіць яго імя, ля помніка пісьменніку ў дзень жалобы сабраліся людзі, каб ускласці кветкі і прыгадаць бессмяротныя словы на яго роднай мове — Якуб Колас прычыніўся да стварэння сучаснай літаратурнай мовы. Нездарма радкі з яго твораў западаюць у душу з дзяцінства, іх носіш у сабе ўсё жыццё і часам яны самі паўстаюць у памяці, нібыта сапраўды напісаныя народам. Ім, Народным паэтам. І гэта званне — на ўсё жыццё ягонай роднай зямлі.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Прамая лінія

СЭРЦА І СТРАЎНІК

Пытанні аб лячэнні сардэчна-сасудзістай сістэмы і страўніка-кішачнага тракта можна задаць загадчыцы тэрапеўтычнага аддзялення Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння **Ірыне Фрыдрыхаўне ЯКІМОВІЧ** падчас «прамой лініі», якая адбудзецца **17 жніўня з 14.00 да 15.00** па нумарах: 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21.

Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах: 8 (017) 287 18 36 (Вольга Шаўко) і 8 (017) 287 18 29 (Святлана Барысенка).

КАРЦЕЛА ДАСАДЗІЦЬ БЫЛОЙ ЖОНЦЫ

І жыхар вёскі Пагост-Загародскі Пінскага раёна павыбіваў у яе доме аж 25 шыбаў. Заведзена крымінальная справа. А беспрацоўны з Давыд-Гарадка проста ўзяў і выбіў шкло ў дзвярах участковай бальніцы. І яму давядзецца адказваць.

Яна СВЕТАВА.

Извещение о проведении аукциона

**ПО ПОРУЧЕНИЮ ОАО «ЭКРАН»
КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»**

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже комплекса зданий, сооружений, и оборудования, расположенных по адресу: г. Борисов, ул. Полка Нормандия-Неман, 167, в составе:

1) Насосная станция оборотного водоснабжения – сооружение 31, об. пл. 399 кв.м; **2)** Корпус 12 – гараж, об. пл. 2336 кв.м; **3)** Хлораторная, об. пл. 62,2 кв.м; **4)** Эстакада для мойки машин ж/б; **5)** Устройство ограждения промплощадок (протяж. 402 м); **6)** Автодороги внутриплощадочные; **7)** Тепловые сети; **8)** Сети водопровода; **9)** Канализационные сети; **10)** Ливневая канализация предприятия; **11)** Внешнее электроснабжение; **12)** Подстанция КТП-1388; **13)** Конденсаторная установка (2 ед.); **14)** Кран балка ЭП-2 (3 ед.). *Начальная цена с НДС (снижена на 20 %) – 772 226 538 белорусских рублей.* Аукцион проводится с условием приобретения победителем аукциона зеленых насаждений (29 деревьев) по рыночной стоимости. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 30.05.2009 г. Аукцион состоится **25.08.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **24.08.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Тел: (8017) 224 61 34. Сайт в интернете: www.rlt.by.

белагропромбанк
традиции будущего

Открытое акционерное общество «Белагропромбанк»

СООБЩАЕТ, ЧТО 20 АВГУСТА 2009 ГОДА ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ

220036, г. Минск, проспект Жукова, 3.

Повестка дня

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, – 12 августа 2009 года.

Акционеры банка могут ознакомиться с материалами по вопросам повестки дня по месту нахождения Правления ОАО «Белагропромбанк»: г. Минск, проспект Жукова, 3.

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы, отделения по месту нахождения акционеров.

Бюллетени для заочного голосования представляются не позднее 18 августа 2009 года.

С решениями, принятыми Общим собранием акционеров банка, можно будет ознакомиться в учреждениях ОАО «Белагропромбанк» после 28 августа 2009 года.

Телефоны для справок: 8(017) 250 36 53, 250 60 01.

КОНТАКТ-ЦЕНТР БАНКА 136
время работы 8.00-22.00 без выходных и праздничных дней;
звонок со стационарного телефона - бесплатно на территории РБ
звонок с мобильного телефона (life:), Velcom, МТС) -
по тарифам операторов мобильной связи.
www.belapb.by

ОАО «Белагропромбанк». Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ от 22.07.2009 г. № 2 УНП 100693551.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ЮШЧАНКА АДКАЗАЎ МЯДЗВЕДЗЕВУ

Прэзідэнт Украіны Віктар Юшчанка 13 жніўня апублікаваў адкрыты ліст да расійскага прэзідэнта Дзмітрыя Мядзведзева.

У пасланні Юшчанка абвінаваціў Расію ў перакладанні адказнасці за «сур'ёзныя праблемы» ва ўзаемаадносінах паміж краінамі выключна на Кіеў і асудзіў адтэрміноўку прыезду расійскага пасла ва Украіну, заявіўшы, што яна не будзе спрыяць канструктыўнаму развіццю адносінаў. Украінскі прэзідэнт назваў «беспадстаўнымі» папрокі ў пастаўках зброі Грузіі, адзначыўшы, што ў дачыненні да Тбілісі не дзейнічаюць ніякія санкцыі або эмбарга з боку міжнародных арганізацый на пастаўкі ўзбраення.

Прэзідэнт Украіны папракнуў расійскі бок у сістэматычных парушэннях заканадаўства Украіны і двухбаковых дамоўленасцяў у пытаннях, звязаных са знаходжаннем Чарнаморскага флоту РФ на тэрыторыі Украіны, адзначыўшы, што ўкраінская канстытуцыя наогул не дапускае размяшчэння замежных ваенных баз на тэрыторыі краіны. Таксама Юшчанка адпрэчыў усе прэтэнзіі расійскага боку, звязаныя з выцясненнем рускай мовы з грамадскага жыцця Украіны, і заявіў, што ў Расіі парушаюцца правы ўкраінскай меншасці на задавальненне нацыянальна-культурных запатрабаванняў. Адначасова з пасланнем Мядзведзеву быў апублікаваны зварот Юшчанкі да ўкраінскага народа. Тэксты двух дакументаў практычна супадаюць.

ГЕРМАНІЯ І ФРАНЦЫЯ ВЫЙШЛІ З РЭЦЭСІІ

ВУП Германіі і Францыі вырас у другім квартале 2009 года на 0,3 працэнта ў адносінах да папярэдніх трох месяцаў, паведамляе Bloomberg. Тым самым эканомікі двюх вядучых краін кантынентальнай Еўропы здолелі выйсці з рэцэсіі.

Эканамічны рост у абедзвюх краінах пераўзышоў чаканні аналітыкаў, якія разлічвалі на скарачэнне ВУП Германіі на 0,3 працэнта, а Францыі — на 0,2 працэнта.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.08.2009 г. (для б/н разлікаў)

▼ 1 долар ЗША	2 848,00
▲ 1 еўра	4 059,82
1 латвійскі лат	5 789,21
1 літоўскі літ	1 175,31
1 чэшская крона	157,46
1 польскі злоты	985,31
▲ 1 расійскі рубель	88,60
1 украінская грыўня	342,39

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	32,1457
UAH	38,8891
1000 BYR	11,1811
EUR	45,8108

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Ордэнам Маці ўзнагароджаны 17 мнагадзетных мам з Віцебскай, Гомельскай і Гродзенскай абласцей

Адпаведны Указ № 420 падпісаў 12 жніўня Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка.

У прыватнасці, за нараджэнне і выхаванне пяці і больш дзяцей узнагароды ўдастоены свінар-аператар філіяла «Нарцызава» ЗАТ «Віцебскагрупрадукт» Талачынскага раёна Алена Сачыўка, паштальён Браслаўскага раённага вузла паштовай сувязі Марыя Шыкшнян, аператар машыннага даення Мазырскай агароднінай фабрыкі Святлана Амяльчук, санітарка Цэнтральнай паліклінікі Гомельскага аддзялення Беларускай чыгункі Фларыяна Пушнегіна, аператар машыннага даення сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва «Галынка» Зэльвенскага раёна Святлана Аласюк, настаўніца Польна-Багатырскай агульнаадукацыйнай базавай школы Гродзенскага раёна Людміла Кузюта.

Прэзідэнт Беларусі павіншаваў Фідэля Кастра Руса з днём нараджэння

«З глыбокай павагай стаўлюся да вашай паслядоўнай пастаяннай работы па перадачы свайго багатага вопыту мудрага палітыка маладшаму пакаленню, да вашай адданасці сваёй Айчыне, справе свабоды і незалежнасці», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік беларускай дзяржавы пажадаў Фідэлю Кастра Русу моцнага здароўя, невычэрпнай жыццёвай энергіі, добрага настрою, поспехаў ва ўсіх пачынаннях.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

«ЁСЦЬ 6 МІЛЬЁНАЎ ТОН ЗБОЖЖА...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Спецыялістаў хвалюе іншае — штодня па тэхнічных прычынах прастойваюць да 300 камбайнаў. У асноўным з-за няспраўнасці рухавіка. 80—90 камбайнаў з-за паломак не выходзяць на палеткі і на наступныя суткі. І гэта ў той час, калі дарагая літаральна кожная хвіліна...

Як заўважыў Уладзімір Кулька, тэхнічны сэрвіс не на ўзроўні. Адпаведныя службы не спраўляюцца з выпраўленнем паломак у вызначаныя тэрміны (любую адмову яны павінны ліквідаваць на працягу не больш чым трох гадзін). Наконт так званай перакідкі тэхнікі пытанне пакуль дэталёва не прапрацоўвалася. Аднак, адзначыў спецыяліст, вопыт паказаў, што гэта мэтазгодна рабіць у межах аднаго раёна ці вобласці. Тады такая мера прыносіць патрэбны эфект. За межы Беларусі (напрыклад, у Расію) камбайны цэнтралізавана адпраўляць не плануецца. Такая перакідка магчымая выключна па дамоўленасці паміж памежнымі сельгаспрадпрыемствамі.

Як заўважыў у размове з карэспандэнтам «Звязды» Уладзімір Гракун, сёння дасягнуты важны паказчык намалоту — 6 мільёнаў тон збожжа. А ўсяго, запэўніў спецыяліст, мяркуецца сабраць больш чым 8 млн тон. Так што будзем з хлебам! Сярод рэгіёнаў па намалотах бясспрэчным лідарам застаецца Мінская вобласць. Леташні рэкордны ўраджай дазволіў захаваць запас, які складае каля 1 млн тон. Напэўна, збожжа не будуць накіроўваць на экспарт, а пакінуць на патрэбы айчыннай жывёлагадоўлі. У такім разе атрымаецца найбольшы эканамічны эфект.

Закупкі сыравіны з-за мяжы апошнім часам стабільна змяншаюцца. Як паведаміў Уладзімір Гракун, калі ў сярэдзіне 1990-х гадоў у нашу дзяржаву завозілася 500 тысяч тон цвёрдых гатункаў пшаніцы, то летась аб'ём адпаведных паставак склаў 170 тыс. тон. А сёлета, як плануецца, будзе завезена яшчэ менш — 80 тыс. тон. Цяпер павялічваюцца палеткі пад пшаніцай: напрыклад, сёлета пад гэтай культурай — 460 тыс. гектараў. Адначасова са жнівом распачалася і сяўба азімых культур. У прыватнасці, гаспадаркі прыступілі да сяўбы азімага рапсу. Калі сёлета яго плануецца атрымаць каля 760 тысяч тон, то ў наступным годзе — да 1 млн тон. Пад ураджай наступнага года ўжо засыпана больш чым 2/3 неабходнай колькасці насення.

Праўда, адзначыў Уладзімір Гракун, узнікаюць цяжкасці з кадрамі — у шэрагу месцаў не хапае як камбайнераў, так і механізатараў. У выніку асобныя гаспадаркі спазняюцца з уборкай саломы. Сельгаспрадпрыемствы пакуль не прыступалі да ўборкі агародніны. Пад гэтымі культурамі — 15 тысяч гектараў. А вось з цяпліц ужо сабрана 66,7 тысячы тон агародніны. Найбольшая частка гэтага паказчыка прыпадае традыцыйна на таматы і агуркі. Але вырошчваюцца і баклажаны, перац, зеляніна.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

Традыцыйнае свята на Блакітнай крыніцы

14 жніўня ў Слаўгарадскі раён на знакамітую крыніцу з'язджаюцца з усёй акругі тысячы чалавек.

Блакітная крыніца — унікальны прыродны помнік і праваслаўная святыня. Яна больш падобная на невялікую сажалку з празрыстай вадой бірузовага адцення і тэмпературай у 8 градусаў круглы год. У старажытнасці тут хрысцілі людзей, а цяпер штогод адбываецца вялікае народнае свята. Раніцай у пятніцу а 8-й гадзіне на крынічнай капліцы пачнецца богаслужэнне. Потым, каля 12 гадзін — хросны ход вакол крыніцы і абрад асвячэння вады. На завяршэнні рэлігійнай часткі — абрад хрышчэння дарослых і дзяцей. Паводле даўняй традыцыі, трэба тры разы перайсці святую крыніцу альбо выкупацца ў ёй, каб атрымаць палягчэнне ў хваробах і ўдачу ў жыцці. Праграму свята працягнуць канцэрт і кірмаш. У гонар Мядовага спаса на Блакітнай крыніцы прадаюць мёд з розных куткоў Магілёўшчыны. Да крыніцы са Слаўгарада можна трапіць праз пантонны мост на Сажы. Рэйсавы аўтобус будзе адпраўляцца кожныя паўгадзіны, ад 7 раніцы і да 15 гадзін, і яго звычайна прапускаюць цераз мост па-за чаргой.

Ілона ІВАНОВА.

Імя ў тытрах

НАШЫ ЛЮДЗІ Ў ГАЛІВУДЗЕ

Галівуд выглядае як звычайная вёска. Але гэта лепшы прыклад кінавытворчасці XXI стагоддзя, дзе ёсць чаму павучыцца. Такую выснову зрабіў Андрэй Курэйчык, вярнуўшыся з-за акіяна, дзе падпісаў кантракт на напісанне сцэнарыя моладзевай камедыі па тэме «Як стаць зоркай?» Пра новыя магчымасці і старыя думкі наконт таго, чаму ў Беларусі гэта немагчыма, Андрэй распавёў на сустрэчы з журналістамі.

Злавіць удачу — гэта...

— Спачатку адзін з прадзюсараў, з якім мне даводзілася працаваць у Расіі, Дэвід Гамбург зацікавіўся фільмам «Юленька». Пазней мяне запрасілі працаваць на серыял, які будуць паказваць па НТБ у верасні. Пасля таго, як я ледзь не загінуў, імкнучыся напісаць 12 серый, убачыўшы маю руплівасць і адзначыўшы якасць, якую я імкнуўся выдаць, Дэвід спытаў, ці не хацеў бы я прыехаць у Амерыку, заключыць кантракт з яго кампаніяй, каб напісаць поўнаметражны сцэнарый для амерыканскага рынку. Давялося адхвяраваць «Любовьморковь-3» і іншымі справамі, але я не шкадую. У Амерыцы я абсалютна ніхто, яшчэ доўга буду сцэнарыстам-пачаткоўцам. Што там раней недзе выходзіла, іх не цікавіць, яны глядзяць толькі па выніках працы. Паводле кантракта, у лістападзе павінен паказаць сцэнарый. Пісаць буду ў Беларусі.

Жыць я там не хачу. Казалі, маўляў, перабірайся. Насамрэч, калі быць шчырым, то прэцэдэнтаў, каб нашы сцэнарысты прабіваліся ў Галівудзе ў вышэйшую лігу, не было. Хоць там жыў Мірдадзе, там жыў Брагінскі ў апошнія гады, усе хацелі працаваць на амерыканскім рынку, але нікому не ўдавалася. Не думаю, што гэта была праблема ў мове, хутчэй, у менталітэце, у пачуцці нацыі. Для мяне гэта цікавы вопыт, вучоба, магчымасць узняцца над той кінематаграфічнай рэчаіснасцю, якая ёсць тут і ў Расіі. У Расіі сітуацыя трошкі лепшая з пункту гледжання якасці, але гэта ўсё адно — пазамінулае стагоддзе ў параўнанні з заакіянскай. У мяне была магчымасць прычыніцца да сучаснага кінематаграфічнага свету.

Я з сям'ёй паўтара месяца жыў там. Азнаёміўся з сістэмай кінематографа ў Амерыцы. Яна вельмі складаная, ёй больш за 100 гадоў. У нас шмат міфаў наконт таго, як працуе амерыканскі кінематограф. Я для сябе шмат якія міфы парушыў. Пазнаёміўся з тымі людзьмі, якія робяць кіно. З агентамі, прадстаўнікамі гільдыі сцэнарыстаў і рэжысёраў. Там усё па-іншаму.

Амерыканская мара — гэта...

— Больш за ўсё мяне ўразіла ў амерыканцах іх унутраная цяга да самарэалізацыі. Поспех гэтай нацыі ў яе бясконцай амбіцыйнасці. Таму сумесь культур, магчыма, таму ў іх атрымліваецца рабіць кіно, якое зразумелае для розных народаў.

Яны разумеюць, што ёсць лакальныя кінарынкі і на гэтых рынках — у Расіі, Японіі, Індыі — час ад часу з'яўляюцца сюжэты, якія маглі б стаць універсальнымі, калі б іх знялі з вельмі вядомымі акцёрамі. Яны шукаюць і знаходзяць сюжэты, скупляюць іх, плацяць за гэта грошы.

У Гільдыі сцэнарыстаў больш за 3000 чалавек. І гэта тыя, хто рэальна піша. Туды не бяруць па размеркаванні і рэкамендацыі. Таму вельмі добрая акцёрская школа, такое адчуванне, што ў Лос-Анджэлесе жывуць адны акцёры. Кожны акцёр можа дзе заўгодна працаваць, хоць афіцыянтам у бары, але будзе хадзіць на ўсе кастынгі і тармасіць свайго агента. Там вельмі высокая канкурэнцыя.

Больш за палову гледачоў свету глядзяць фільмы, якія зроблены ў Галівудзе. Гэта трэба вывучаць. З іншага боку — не быць вельмі агульным у высновах, бо і там шмат праблем.

Зорка ў Беларусі — гэта...

— Зорка — складанае паняцце. Напрыклад, зорка ў сцэнарыстыцы — гэта не той чалавек, якога ведаюць мільёны людзей. Можна ўспомніць цудоўныя фільмы, хто іх зняў, акцёраў, якія ігралі. Але ніхто не ўспомніць, хто іх напісаў. Хоць у прафесійнай супольнасці гэтыя сцэнарысты не проста зоркі, а Богі-стваральнікі. Мне бліжэй такое разуменне зорнасці: калі цябе цэняць прафесіяналы, з якімі ты працуеш. А для публічных прафесій, безумоўна, вельмі важна быць шырокавядомым. Сяргей Міхалок і «Ляпіс Трубецкой» — гэта для мяне зоркі. А наша папулярная музыка — гэта не зоркі. Майкл Джэксан — зорка. З яго пасміхаліся ў Амерыцы, але калі памёр, там была вялікая жалоба...

Зоркі фарміруюцца публічнай прасторай. У нас вельмі вузкая і нейкая няшчасная публічная прастора. Гэта перш за ўсё мас-медыя і магчымасць канцэртаў для музыкантаў, здымкаў для акцёраў. Наша беларускае кіно дрэннае, канцэрты ў нас не лепшыя...

Што да мяне, то ў мяне тут практычна няма працы ў апошнія тры з паловай гады, за выключэннем рэдкіх праектаў. Я быў практычна ў стане беспрацоўя. Справа ў тым, што ў нас яшчэ не выбудавана сістэма адносінаў паміж заказчыкам — кінастудыяй ці Міністэрствам культуры, ці іншай установай — і творчымі людзьмі. Сістэмы няма. І няма ў нас рынку працы для творчых людзей. Хто каго ведае, той і можа прасунуцца. Ёсць людзі, якія пішуць, самі спрабуюць нешта арганізаваць. Але калі няма рынку, то кожны раз як у першы.

Беларускае кіно — гэта...

— Беларускае кіно я ацэньваю як звычайны глядач — гэта не тое кіно, якое хацелася б глядзець. Чаму гэтыя фільмы з'яўляюцца? Напэўна таму, што ў нас няма крытэрыяў аддбору, калі лепшае падымаецца, а дрэннае адкідаецца. Усё варыцца ў адным катле. Аднак мы, падаткаплацельшчыкі, плацім за тое, каб нашы рэжысёры здымалі, а потым гэтыя фільмы клаліся на паліцу. І яны працягваюць здымаць. Таму што няма крытэрыяў правалу. У свеце ўсё дакладна: гэты фільм атрымаў поспех згодна з камерцыйнымі крытэрыямі, той — з фестывальнымі. А яшчэ нейкі — праваліўся, паводле такіх і такіх крытэрыяў, таму няхай гэты рэжысёр зойметца нечым іншым. У нас гэтага няма. Узяць апошнюю прэм'еру — патрацілі вялікую суму дзяржаўных грошай. Паказалі на прэм'еры ў кінатэатры і вельмі хутка па тэлебачанні. Фільм па якасці слабы. Хоць нехта прэміі пазбавіўся за гэта? Па ўсіх сусветных паказчыках, ды і здаровы сэнс падказвае, што гэта правал: расійскія пракатчыкі і тэлеканалы фільм не ўзялі. Хто-небудзь адкажа за гэты правал? За грошы?

Чаму кажуць: толькі прадзюсарскае кіно павінна быць, няма іншага спосабу ў рынкавай эканоміцы арганізацыі кінавытворчасці. Прадзюсар — не той, хто вымае з кішэні пачкі долараў і махае імі, а той, хто бярэ на сябе творчую і фінансавую адказнасць за вынік кінавытворчасці. У нас: адны людзі выбіраюць сцэнарый, яны перадаюць яго рэжысёру, які не ўдзельнічаў у выбары сцэнарыя, але здымае. Далей стужка перадаецца ў кінапракат... А прадаць гэта немагчыма. Атрымліваецца, усіх шмат — і ніхто ні за што не адказвае. Аднак першапачаткова, калі бярэцца ў рукі сцэнарый, усю зразумела: можна яго прадаць, ці не.

Я спадзяюся, што ў Беларусі зразумеюць адну простую рэч, што мастацтва — гэта не будынак, не рамонты, не справаздачы. Мастацтва — гэта вынікі: фільмы, музычныя дыскі, карціны і г.д. Калі ў нас будуць адчыняваць оперы, а не тое, як пафарбаваныя сцены ў тэатры, тады можна будзе гаварыць пра тое, што ў гэтай краіне сапраўды любяць мастацтва.

Кіно пра вайну — гэта...

— Святая тэма. У Беларусі кожны рана ці позна павінен выказацца на гэтую тэму, я таксама не стаў выключэннем. У верасні пачнуць здымаць у Беларусі 4-серыйны фільм пад працоўнай назвай «Смяротная схватка» для канала РТР. Здымаць будзе Аляксандр Франскевіч, рэжысёр фільма «У ліпені 41-га». Гэта мая спроба сказаць нешта пра вайну, хоць погляд не зусім звычайны.

Запатрабаванасць на радзіме — гэта...

— Важна, бясспрэчна. Я не адчуваю сябе закінутым. З верасня я буду выкладаць драматургію ва Універсітэце культуры. Паспрабую перадаць тое, што ўмею. У мяне ёсць, па-мойму, цудоўная ідэя для кіно. Я вельмі хачу зрабіць фільм пра Віцебскі перыяд Марка Шагала. Мне здаецца, што ў ХХ стагоддзі ў нас не было большай знакамітасці і таленту. У нас засталіся віцебскія вулачкі, якія можна зняць. Дагэтуль у нас у кіно была вайна і вёска. Кінематограф Беларусі не ўспрымаецца як «культурнае кіно». Давайце паказваць, што мы — культурная нацыя. У розных краінах прынята здымаць пра сваіх знакамітасцяў. Для мяне акрама Васіля Быкава, Марк Шагал — чалавек, які стаў тым, каго ведаюць у свеце паўсюдна. Нікога так не ведаюць. Яго сапраўды можна назваць самым знакамітым беларусам. Гэтая тэма мяне хвалюе. Мне здаецца, «Беларусьфільм» можа вырвацца з ваеннага і вясковага атачэння.

Сёлета адбудзецца маё вяртанне ў тэатральную драматургію: я напісаў п'есу для нацыянальнага тэатра імя Горкага. Гэта важны момант, таму што ў мяне быў перапынак у некалькі гадоў. Апошні час я не пісаў тэатральных п'ес увогуле, і ўжо мне здавалася, што я не вярнуся да іх ніколі. Прыйшоў новы галоўны рэжысёр тэатра Сяргей Кавальчык, і ён прасіў напісаць п'есу для Расціслава Янкоўскага. Я хвалююся, таму што вельмі змяніўся мой стыль, змяніўся драматург Курэйчык.

Вынік у Галівудзе — гэта...

— Безумоўна, гэта новыя магчымасці, і мне страшна за вынік — увогуле кожны раз. Якасць і стаўленне да працы для мяне на першым месцы — што ў расійскім праекце, што ў амерканскім, што быў бы беларускі. Для мяне пытанне самавыяўлення важнейшае за тэрыторыю, на якой гэта адбываецца.

Запісала Ларыса ЦІМОШЫК.

Абзац

◢ На Баранавіцкай птушкафабрыцы дзве жанчыны загінулі пад сцяной збожжасховішча, якая абвалілася. Падчас праліўнога дажджу жанчыны 1958 і 1971 гадоў нараджэння схаваліся ля цаглянай сцяны збожжасховішча. Нечакана сцяна абрынулася на плошчы 20 кв.м. Супрацоўніцы птушкафабрыкі, якія апынуліся пад заваламі, атрымалі траўмы, не сумяшчальныя з жыццём.

◢ **Дарожна-транспартнае здарэнне з удзелам двух мікрааўтобусаў адбылося ў Чэрвеньскім раёне Мінскай вобласці. На 81-м кіламетры аўтадарогі Мінск—Магілёў кіроўца маршрутнага таксі «Фіят- Дуката», рухаючыся ў бок Магілёва, выехаў на паласу сустрэчнага руху і сутыкнуўся з грузапасажырскім аўтамабілем такой жа маркі. Цялесныя пашкоджанні атрымалі 6 чалавек, 5 з якіх пасажыры маршрутнага таксі. У іх пераломы канечнасцяў, ірваныя раны, вывіхі.**

◢ Сабакі здольныя разумець 250 слоў і жэстаў, лічыць да пяці, а таксама здзяйсняць прасцейшыя матэматычныя дзеянні. Гэта ўстанавіла група навукоўцаў з горада Ванкувер. Як заявіў кіраўнік даследаванняў, па сваім разумовым узроўні сабакі не саступаюць 2-гадоваму дзіцяці. Навуковая група падрыхтавала рэйтынг пародсабак у залежнасці ад іх інтэлектуальных здольнасцяў. Самым разумным прызнаны бордэр-колі. На другую пазіцыю выйшаў пудзель, першую тройку замыкае нямецкая аўчарка.

◢ **Аплаціць праезд у гарадскім транспарце Варшавы пасажыры змогуць з дапамогай мабільнага тэлефона. З 14 жніўня паслугай могуць скарыстацца абаненты ўсіх кампаній мабільнай сувязі, якія працуюць на польскім рынку. Каб аплаціць праезд, пасажыр павінен патэлефанаваць на спецыяльны нумар і зарэгістравацца. Пасля гэтага можна купляць праязныя талоны, злучаючыся з тым жа нумарам. Кошт за праезд будзе вылічвацца з рахунка абанента. Купіць талон па тэлефоне вельмі проста: пасля злучэння неабходна выконваць галасавыя інструкцыі. У выпадку праверкі талонаў пасажыр можа патэлефанаваць на бясплатны нумар, які паказаны на бэйджы кантралёра. Пацвярджанне аб аплаце праезду імгненна прыходзіць на электронны сканер, які ёсць у кожнага варшаўскага кантралёра.**

◢ Амерыканская авіякампанія JetBlue выпусціла ў продаж месячныя праязныя квіткі. Квіток коштам $599 дае магчымасць здзейсніць неабмежаваную колькасць паездак у любы з гарадоў ЗША і за іх межамі, у якія здзяйсняюць рэйсы лайнеры JetBlue. Напрыклад, у Мексіку, Коста-Рыку і краіны Карыбскага басейна. Акрамя таго, уладальнік такога праязнога дакумента атрымлівае права выбару месца ў самалёце па сваім гусце, незалежна ад яго класа. Кошт такога праязнога квітка ў шэсць разоў перавышае кошт месячнага праязнога ў метро Нью-Ёрка.

◢ **На 47-м кангрэсе Міжнароднай асацыяцыі лёгкаатлетычных федэрацый прынятае рашэнне аб адмене фальстарту з 1 студзеня 2010 года. У выпадку здзяйснення фальстарту спартсмен будзе дыскваліфікаваны. На некаторых турнірах і кантынентальных спаборніцтвах магчыма дзеянне старога правіла, калі дазваляўся адзін фальстарт, аднак ужо на 13-м чэмпіянаце свету, які пройдзе ў Карэі ў 2011 годзе, у дзеянне ўводзіцца новае правіла.**

◢ Кампанія Microsoft прайграла судовую справу па абароне інтэлектуальнай уласнасці. У яе з'явіліся праблемы з адным з самых папулярных прадуктаў — праграмай для працы з тэкставымі файламі Word. Федэральны суд ЗША прызнаў, што Microsoft паквапілася на патэнт канадскай фірмы i4i, які датычыцца выкарыстання мовы праграмавання XML, якая ляжыць у аснове Word. Зараз Microsoft давядзецца выплаціць фірме i4i кампенсацыю ў памеры $290 млн. Акрамя таго, Microsoft можа пазбавіцца права продажу Word.

Поўны абзац

◢ Канцэрт брытанскай групы The Prodigy адбудзецца 5 кастрычніка на мінскім стадыёне «Дынама» ў рамках фестывалю UltraMusicFestival. Арганізатары канцэрта размясцілі рэкламу гэтага мерапрыемства на курыных яйках, якія прадаюцца ў беларускіх крамах.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки»

➢ **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)**
➢ **ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

извещает о проведении 16 сентября 2009 г. открытого аукциона по продаже объекта недвижимости, расположенного по адресу: г. Гомель, ул. Федюнинского, 19 и принадлежащего ОАО «Ратон» на праве собственности

№ лота	Наименование объектов	Краткая характеристика объектов
1	**Изолированное помещение № 2 (инв. № 350/D-149421)**	Складское помещение с бытовым корпусом общей площадью 3707 кв.м. Расположено на 1-2 этажах, антресоли. Земельный участок для эксплуатации и обслуживания здания производственного корпуса по ул. Федюнинского, 19 в общем долевом пользовании: кадастровый номер 340100000002002680, площадью 0,9519 га. Решение Гомельского ГИК № 286§27 от 18.03.2009 г., договор аренды № 4499 от 02.04.2009 г. Склад – одноэтажный площадью 3562,4 кв.м, год постройки – 1988, фундамент – железобетонные блоки; стены наружные – железобетонные панели, кирпич, 3-слойные стеновые панели с обшивкой из стального профиля с утеплителем; стены внутренние – кирпичные; крыша – совмещенная; полы – цементные, плитка; проемы оконные – двойные деревянные, дверные – деревянные. Бытовой корпус – 2-этажный, площадью 144,6 кв.м, год постройки – 1988, фундамент – железобетонные блоки; стены, перегородки – кирпич; перекрытия – железобетонные плиты.
	Принадлежности к изолированному помещению № 2 (инв. № 350/D-149421)	Проезжая часть (асфальтобетонная) – площадь 1236 кв.м; тротуар (асфальтобетонный) – площадь 119,4 кв.м; тротуар (плитка бетонная) – площадь 30,2 кв.м; бортовой камень проезжей части – протяженность 192,1 п.м, материал – бетон; подпорная стенка из фундаментных блоков – протяженность – 120,2 п.м, материал – бетон.
	Передаточные устройства	Сети ливневой канализации, инв. № 350/С-72554; сети фекальной канализации, инв. № 350/С-72528; тепловая сеть инв. № 350/С-72535; кабельная линия электропередачи инв. № 350/С-72557.
	Многолетние насаждения	Клен, ясень, верба, липа – всего 11 единиц

Начальная цена продажи лота – 1 596 528 200 бел. руб. (в т.ч. НДС 18 %). Задаток – 3 000 000 бел. руб. (в т.ч. НДС 18 %). Цель использования объекта: не ограничивается. Шаг аукциона – 8 %.

Аукцион состоится 16 сентября 2009 г. Начало в 10.00 по адресу: г. Гомель, ул. Артема, 23, каб. 2–6

Документы на участие в аукционе принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2–6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 15.00 по **15 сентября 2009 г. включительно.** Подача документов по почте не допускается.

Условия продажи лотов: в аукционе имеют право участвовать индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица.

При подаче заявления участник должен иметь: 1) заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; индивидуальный предприниматель – паспорт, копию свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя и его подлинник для заверения его копии организатором аукциона; представитель индивидуального предпринимателя – паспорт и доверенность; представитель юридического лица (резидент РБ) – паспорт (руководитель – копию приказа, протокола о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и на подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации организации и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; представитель юридического лица (нерезидент РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса иностранного юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица расчетного счета, необходимо открыть текущий счет.

Задаток для участия в аукционе перечисляется на **р/с 3012054725420 в фил. № 300 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 151501661. Получатель платежа – РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки». УНП 490318588.**

Выигравшим торги на аукционе признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем, будет засчитан в счет окончательной стоимости объектов. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителями аукциона, Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель торгов обязан: в течение 3-х рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 1 % от цены продажи лота, сформированной на аукционе; в течение 20 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи объектов; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость объекта, сформированную на аукционе.

Организатор торгов или Продавец вправе снять объекты (лот) с торгов до объявления его проданным.

Контактные телефоны Организатора аукциона: ☎ 8 (0232) 70 46 47, 74 99 76

Бернд ШТАНГЕ:

Поўнае расчараванне

«ХАРВАТЫ НАС ЗАГНАЛІ»

На пасляматчавай прэс-канферэнцыі апоўначы 12 жніўня Бернд Штанге быў такі ж афарыстычны і аптымістычна настроены, як і заўсёды, нягледзячы на пройгрыш сваёй каманды зборнай Харватыі 1:3. Сэнс усяго матча галоўны трэнер беларусаў падвёў адной фразай «Маленькі сабачка імкнуўся пакусаць вялікага, але сёння гэта ў нас не атрымалася». Бернд Штанге меў на ўвазе вялікую розніцу ў класе камандаў, адлюстраваную рэйтынгам ФІФА — 10-е месца харватаў супраць нашага 74-га. Калі да пядынку шанцы на другое месца ў групе захоўвалі харваты, беларусы і ўкраінцы, то пасля гульні трапіць у фінал чэмпіянату свету беларусы тэарэтычна яшчэ могуць, хоць насамрэч усе разумеюць, што чарговая кваліфікацыя прайграная.

Што б ні казалі балельшчыкі і спецыялісты, якія незадаволеныя і кандыцыямі асобных гульцоў, і выкарыстаннем пэўных футбалістаў на спрэчных пазіцыях, відавочным застаецца той факт, што наша каманда саступае ў класе грандам. Адно, у чым не адмовіш нашым футбалістам — у тым, што біліся да апошняга, наколькі дазвалялі ўласныя магчымасці. Нельга не пагадзіцца са Штанге, што няма сэнсу разважаць пра форму Глеба і Кутузава, калі ўся каманда тэхнічна і функцыянальна слабейшая за апанента. «На найвышэйшым узроўні футбола ўсё вырашае якасць. Адны і тыя ж каманды з'яўляюцца лепшымі на працягу дзесяцігоддзяў. Мы не можам канкурыраваць на гэтым узроўні», — прызнаўся нямецкі спецыяліст. З'яўленне на пазіцыі левага паўабаронцы Мікалая Кашэўскага — чарговы камень у агарод эксперыментаў Штанге, але сам трэнер застаўся задаволеным гульцом. «Мы паставілі Кашэўскага на гэту пазіцыю, бо хацелі яшчэ больш атакуючага футбола. Ён справіўся са сваім заданнем». Як прызнаўся галоўны трэнер харватаў Славен Біліч, які па ўсім відаць, нядрэнна вывучыў нашу каманду, на месцы Кашэўскага ў складзе нашай зборнай яны чакалі Ігара Стасевіча, а ў абароне рыхтаваліся ўбачыць Ігара Шытава, а ў якасці нападаючага меркавалі супраць-стаяць Кутузаву. Так што Штанге ўсё ж здолеў здзівіць суперніка.

Адной з няўдач матча для беларусаў Бернд Штанге назваў праблемы ў абароне: «Там у нас нестабільна і мы давалі суперніку шмат магчымасцяў. А ўвогуле харваты гулялі так, як мы марым гуляць. Яны стамілі нас, загналі. На лаўцы запасных у нас няма гульцоў з «Гамбурга» ці «Шальке-04». Не ў форме Глеб і Кутузаў, і наша машына не ідзе...». У той жа час галоўны трэнер беларусаў падкрэсліў, што ён не зломлены: «Вы бачыце, я не ў жалобе, хоць гэта канец нашай кар'еры ў кваліфікацыі. У нас ёсць стабільная зборная.» Нягледзячы на тое, што капітан каманды Аляксандр Глеб напярэдадні гульні меркаваў, што калі матч харватам будзе прайграны, застанецца нагульваць моладзь, Бернд Штанге запэўніў, што і Глеб, і Кутузаў будуць гуляць да канца кваліфікацыйнага адбору. «Супраць Украіны, Харватыі, Англіі мы не будзем выпускаць моладзь. З гэтай камандай мы будзем заканчваць гэту кваліфікацыю і пачынаць наступную. І Глеб, і Кутузаў будуць гуляць далей — гэта іх маральны абавязак перад краінай». Што ж, балельшчыкам застаецца спадзявацца, што маральны абавязак футбалісты выканаюць да канца, і напарадзе нас чакаюць перамогі.

Свой наступны матч у гэтым адборачным цыкле беларусы правядуць 5 верасня на выездзе супраць той жа Харватыі. Бернд Штанге разважаў пра гэты матч без аптымізму: «У мяне няма магчымасці ўраўняць нашых футбалістаў у класе з супернікам. У нас няшмат футбалістаў гуляе ў камандах міжнароднага ўзроўню — 1-2. Я абсалютна ўпэўнены, што ў камандзе сабраныя лепшыя на сёння гульцы. Але ў нас вялікія праблемы ў абароне — футбалісты панікуюць, калі на іх нападаюць, губляюць бачанне гульні. Нашыя магчымасці абмежаванныя...».

У той жа дзень, 12 жніўня, беларуская моладзевая зборная (U-21) на стадыёне ў Маладзечне прымала равеснікаў з Аўстрыі у межах адбору на чэмпіянат Еўропы-2011. Два галы ў выкананні Уладзіміра Юрчанкі і Ягора Філіпенкі вырашылі вынік сустрэчы. Аўстрыйцы змаглі адказаць толькі мячом Байхлера. Наступны адборачны матч наша моладзевая каманда правядзе 9 верасня ў гасцях супраць аднагодкаў з Азербайджана.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НУ І НУ!

92-ГАДОВЫ ПАРУШАЛЬНІК ПДР

Увечары 12 жніўня на сталічнай вуліцы Я. Коласа маладая жанчына на аўтамабілі «Фальксваген-Пола» ўчыніла наезд на пешахода. Мужчына пераходзіў дарогу ў нявызначаным для гэтага месцы. Як потым высветлілася, парушальнікам аказаўся пенсіянер 1916 года нараджэння! У выніку ДТЗ 92-гадовы пешаход атрымаў цялесныя пашкоджанні ў выглядзе чэрапна-мазгавой траўмы лёгкай ступені і ўдары скроневай вобласці галавы.

Як адзначыў інспектар аддзела па агітацыі і прапагандзе ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама Аляксей Бруй, у апошні час у сталіцы пачасціліся наезды на састарэлых пешаходаў, якія пераходзяць праезную частку ў нявызначаных месцах. У асноўным гэта паважаныя людзі — ветэраны працы і Вялікай Айчыннай вайны.

Ул. інф.

Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне дэпутату Палаты прадстаўнікоў першага і трэцяга скліканняў Кулакоўскаму Юрыю Аляксандравічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.

Рэдакцыя газеты «Звязда» выказвае глыбокае спачуванне дэпутату Палаты прадстаўнікоў першага і трэцяга скліканняў Кулакоўскаму Юрыю Аляксандравічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.

Утерянный бланк квитанции 1-СУ серии КС № 0484487, принадлежащий ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», **считать недействительным.**

Утерянные бланки страховых полисов серии НС №№ 0066242–0066262, 0078956-0078959, 0079155, 0079156, 0079170-0079172, 0080123-0080125, 0080298, 0080299, 0083047-0083048, 0083982, 0084282, 0086859, 0087504-0087505, 0084603, 0087604, 0087628-0087633, 0087643, 0088926, 0090651, 0091460, 0094693-0094695, 0099238-0099240, 0099896, 0109849, 0109851-0109856, 0110146, 0110311-0110316, 0112473, 0112483-0112485, 0112949, 0112951, 0112952, 0113319, 0114528-0114559, 0114563, 0114568, 0114572, 0114573, 0114576, 0115155, 0115166, 0115999, 0118748, 0118479, 0120416, 0120883, 0120884, 0120886-0120888, 0120924, 0120925, 0122868, 0122869, 0122871-0122874, 0125425-0125428, 0125437, 0126466-0126472, 0128416, 0128417, 0129110, 0135317, 0135990, 0136557, 0136559-136570, 0138452, 0138944-0138947, 0140305, 0140505,0141188, 0141335, 0142728, 0144159, 0144293-0144296, 0145126, 0146302, 0146304-0146320, 0147014 в количестве 204 шт., принадлежащие ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», **считать недействительными.**

ИЗВЕЩЕНИЕ

**о созыве внеочередного общего собрания акционеров ОАО «ЭКСПЕРИМЕНТАЛЬНЫЙ ЗАВОД

Заснавальнік — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 12 ад 19 лютага 2009 г.

14 ЖНІЎНЯ 2009 г. ПЯТНІЦА № 30 (15584)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

ІДЭІ Ў АДКРЫТЫМ ПАВЕТРЫ

20 маладых і вядомых гуртоў з Беларусі, Украіны, Польшчы і нават Францыі сустрэнуцца на фестывалі ў Чарнігаве.

У маляўнічым месцы на беразе ракі Дзясны на працягу двух дзён будзе гучаць рок пад адкрытым небам. І ўсё гэта дзеля таго, каб засведчыць, што музыка дае права самавыяўляцца людзям у розных краінах. Моладзевасць, нефарматнасць, адкрытасць — галоўныя рысы фестывалю «Be Free», які адбываецца на адкрытай пляцоўцы.

Аднак прыклад маладым будуць падаваць вопытныя і вядомыя «Воплі Відаплясава» ад Украіны і «Ляпіс Трубецкой» з Беларусі. Але за два дні 22 і 23 жніўня ў Чарнігаве выступіць даволі шмат беларускіх гуртоў, якія ў нас вельмі часта значацца як «нефармат». У адкрытай музычнай прасторы ёсць права на любыя творчыя ідэі.

Чарнігаў стаў месцам правядзення фестывалю, таму што гэты ўкраінскі горад знаходзіцца недалёка ад межаў Расіі і Беларусі, аднак аматары музыкі з Польшчы і Літвы змогуць прыехаць сюды без візы. Непадалёк ад сцэны для гасцей з іншых мясцінаў будзе арганізаваны палатачны гарадок. Таму слухачоў чакаецца шмат, тым больш, што ніякія квіткі непатрэбныя, каб патрапіць на фестываль. Летась, між іншым, колькасць слухачоў на фестывальных канцэртах дасягала 10 тысяч.

Для маладых беларускіх музыкаў асабліва важна нават не тое, што іх пачуе вялікая колькасць людзей. Гэта яшчэ магчымасць абменьвацца творчымі ідэямі, здабыць кантакты ў суседніх краінах. І хто ведае — можа колькасць ахвотных скакаць пад нашу дудку будзе павялічвацца?

Ларыса ЦІМОШЫК.

ВАЛАНЦЁРЫ ДАПАМАГАЮЦЬ ЗАПАВЕДНІКУ

У Бярэзінскім біясферным запаведніку гэтымі днямі працуюць удзельнікі IV Рэспубліканскага валанцёрскага экалагічнага лагера «Мерыдыян».

Валанцёры БРСМ наводзяць парадак у лесе — ачышчаюць яго ад сухастою, а таксама нарыхтоўваюць корм для жыхароў запаведнай тэрыторыі, уладкоўваюць вальеры, ачышчаюць падземныя пераходы для земнаводных праз ажыўленыя трасы, пракладаюць новыя экалагічныя сцежкі. Уся гэта дзейнасць, па-першае грунтуецца на пэўных правілах, паводле якіх, работа вядзецца на грамадскіх пачатках, па-другое, «мерыдыянцы», як адзін, трымаюцца здаровага ладу жыцця, а, па-трэцяе, усе справы робяцца выключна камандай.

Дарэчы, валанцёры-эколагі «Мерыдыяна-2008» перамаглі ў леташнім Рэспубліканскім конкурсе на лепшы студэнцкі атрад і лепшага наймальніка ў намінацыі «Лепшы валанцёрскі атрад», а таксама былі на вышыні ў конкурсе «Моладзь за чысціню гарадоў і вёсак 2008».

Святлана БАРЫСЕНКА.

«ВЫШЭЙШЫ ПІЛАТАЖ» МАТЭМАТЫЧНАЙ ШКОЛЫ БДУ

З залатымі і сярэбранымі ўзнагародамі вярнуліся з XVI Міжнароднай студэнцкай матэматычнай алімпіяды студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гэтыя прэстыжныя інтэлектуальныя спаборніцтвы праходзілі з 25 па 30 ліпеня ў Будапешце. Усяго ўдзел у іх узялі 350 студэнтаў, якія прадстаўлялі 75 універсітэтаў з 35 краін, у тым ліку з Расіі, Украіны, ЗША Заходняй і Усходняй Еўропы, Ірана, Бразіліі і іншых.

Гонар беларускай вышэйшай школы адстойвалі студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. На працягу двух дзён удзельнікам алімпіяды было прапанавана рашыць 12 задач: кожны дзень на рашэнне шасці задач адводзілася 5 гадзін.

Кожная задача ацэньвалася ў 20 балаў. Заданні ахоплівалі наступныя раздзелы матэматыкі: матэматычны аналіз, функцыянальны аналіз, тэорыю функцый комплекснай пераменнай, лінейную і абстрактную алгебру, геаметрыю і камбінаторыку. Рабочай мовай алімпіяды была англійская.

Студэнты БДУ ўдзельнічалі ў гэтых спаборніцтвах ужо ў дзявяты раз, прычым не было ніводнага разу, каб яны вярнуліся ў сцены сваёй альма-матар без узнагарод. Усяго з 2001 года імі было заваявана ў агульнай складанасці 32 залатыя, 22 сярэбраныя і 5 бронзавых медалёў.

У гэтым годзе ўзнагароды самай высокай пробы заваявалі студэнт 4-га курса факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Руслан Максімаў, пяцікурснік механіка-матэматычнага факультэта Уладзімір Ягораў і студэнт 4-га курса ММФ Іван Блізнец. Сярэбраныя медалі — у Міхаіла Карпука (4-ы курс ММФ), Дзяніса Пірштука (2-і курс ФПМІ) і Міхаіла Глушчанкі (2-і курс ФПМІ).

Надзея НІКАЛАЕВА.

НЕ КАЖЫ «ГОП», ПАКУЛЬ... НЕ ЗНАЙШОЎ, ДЗЕ ЖЫЦЬ!

Залічэнні на дзённыя формы навучання ва ўстановы вышэйшай і сярэдняй адукацыі краіны амаль завяршыліся. Былыя абітурыенты, якія паступілі ў ВНУ ці каледжы, ходзяць па вуліцах з шырокімі ўсмешкамі: «Наперадзе студэнцкае жыццё! Шчасце якое!» Але, як чалавек бывалы, магу з упэўненасцю сказаць: «Для іншагародніх абітурыентаў пасля залічэння ўсё толькі пачынаецца!» На будучых студэнтаў навальваецца жыллёвая «ліхаманка». Знайсці прытулак на навучальны год у чужым горадзе вельмі складана і нават немагчыма. Паспрабуем!

ПРЫСТАНАК № 1.
СТУДЭНЦКІ ІНТЭРНАТ

Апынуцца 1 верасня ў студэнцкім інтэрнаце — мара кожнага першакурсніка. Нідзе так не адчуваецца дух студэнцкага жыцця, як там. Шматмесныя пакоі, агульная кухня, усе дружна разам гатуюць ежу, рыхтуюцца да заняткаў, спяваюць песні пад гітару... Ды і каштуе месца ў пакоі капейкі. Але інтэрнаты не гуманізуюць, і змясціць усіх ахвотных, у тым ліку студэнтаў старэйшых курсаў, не могуць. Розныя ўстановы адукацыі па-рознаму размяркоўваюць месцы ў інтэрнатах. Напрыклад, найчасцей у ВНУ 20 % месцаў ад агульнай колькасці ахвяруюцца наваспечаным студэнтам. Так, калі адзін інтэрнат змяшчае 600 чалавек, то 120 з іх — першакурснікі. Прытым у ВНУ ёсць некалькі інтэрнатаў. Лічба заселеных першакурснікаў атрымліваецца немалая. Але і гэтага не хапае.

Часцей за ўсё ложка-месца атрымлівае той студэнт, які мае нейкія льготы ці набраў рэкордна высокія балы пры паступленні. Усе гэтыя перавагі нельга хаваць! Толькі ўбачылі сваё прозвішча ў спісе залічаных — хуценька бяжыце пісаць заяву на месца ў інтэрнаце (узор заявы вывешваюць на дзвярах дэканатаў, у холе, на дошках інфармацыі). Да заявы дадайце даведку аб заробку бацькоў, аб складзе сям'і, паперу, якая дае права на льготу (калі яна ёсць) ці даведку з дэканата аб высокіх набраных балах. Некаторыя ўстановы патрабуюць дадатковыя паперы — спраўцеся аб гэтым у дэканаце ці ў прыёмнай камісіі.

Нават калі льготаў і высокіх балаў няма, рукі апускаць нельга. Аддайце необходныя дакументы — вас абавязкова паставяць у чаргу.

ПРЫСТАНАК № 2.
КВАТЭРА СВАЯКОЎ

З інтэрнатам не пашанцавала? Звяртайцеся да родных, якія жывуць у гэтым горадзе, і прасіце ў іх прытулку. Гэта самы дакладны спосаб: вакол будуць добра знаёмыя людзі, накормяць вас, заўсёды дапамогуць, і плаціць завобласлачныя грошы не трэба. Здаецца, адны плюсы. Але так здараецца не заўсёды. Разважаць трэба так: я прыехаў(ла) сюды вучыцца. Для гэтага патрэбны месца, дзе можна скласці свае асабістыя рэчы, падручнікі, дзе можна пісаць, чытаць, адпачыць, сустракацца з сябрамі. Але бывае, што родныя гэтага падаць не могуць: у кватэры жывуць зусім малыя дзеці, няма асобнага ложка для вас. Тады трэба задумацца, ці не перашкодзіць гэта вучобе?

Бывае такое, што родныя ўскладаюць на сябе занадта шмат «абавязкаў»: кантралююць кожны крок госця, забараняюць прыходзіць позна, уключаць святло пасля адзінаццаці, працаваць доўга за камп'ютэрам, карыстацца часта вадой. Бывае, гаспадары кватэры кідаюць «касякі» на беднага студэнта. Здаецца, гэта кінастужка жахаў! Але ўсё можа здарыцца.

Прапаную будучым студэнтам перад засяленнем да родных сур'ёзна пагаварыць з імі наконт умоў і правілаў пражывання. Гэта вельмі важна, каб паміж вамі і гаспадарамі не было недамовак.

ПРЫСТАНАК № 3.
ЗДЫМНЫ ПАКОЙ

Здымаць пакой студэнту не надта салодка. Па-першае, трэба яшчэ знайсці гаспадароў, якія здаюць жыллё. Слова «здадзена» некалькі дзясяткаў разоў парэжа слых студэнта. Але апускаць рукі не трэба. Выкарыстайце ўсе крыніцы для пошуку свабоднага пакоя: рэкламныя газеты, запасы нумароў, якія захаваліся ў старэйшых студэнтаў. Часта адрасы здымных пакояў гаспадары пакідаюць у студэнцкім прафкаме, на вахце ў карпусах універсітэта.

Другая праблема ў тым, што маладому чалавеку трэба ўжыцца ў адной кватэры з цалкам чужымі людзьмі. Яны клічуць да сябе «ў госці» не таму, што ім так падабаецца, а таму, што ім патрэбны грошы. А грашовыя адносіны не прадугледжваюць нармальных стасункаў. Вось і здараецца такое, што студэнты аказваюцца ў палоне забаронаў: нельга прывозіць свой камп'ютар, нельга электрапрыборы, нельга, нельга... Таму неабходна загадзя даведацца аб правілах, якія вызначаюць гаспадары.

Трэцяя праблема — прыбіранне. Увесь час паўстаюць пытанні: хто насмеціў і хто павінен прыбіраць? Можна зразумець гаспадароў: яны не слугі, каб прыбіраць за студэнтамі. Але і студэнты не павінны ператварацца ў рабоў. Графік дзяжурстваў не дапаможа. Усё адно гаспадар заўсёды «мае рацыю». Раю адразу абгаварыць сваю тэрыторыю, за якую вы будзеце адказваць. Тэрміновае і сумленнае яе прыбіранне дапаможа пазбегнуць канфліктаў.

Яшчэ адна непрыемнасць чакае студэнта на здымным пакоі — цана на метры будзе расці як грыбы пасля дажджу. Спрачацца з гаспадарамі нельга. У адказ студэнт атрымлівае стандартны адказ: «На тваё месца будзе 20 такіх!» І гэта сапраўды так. А праблему павышэння цаны можа вырашыць толькі сумленне гаспадароў.

ПРЫСТАНАК № 4.
ЗДЫМНАЯ КВАТЭРА

На здымнай кватэры вам не будуць дакучаць гаспадары. Але жыць аднаму нават у аднапакаёўцы — гэта вельмі дорага не толькі для самога студэнта, але і для яго бацькоў. Акрамя грошай за здымманне, студэнт павінен аплаціць камунальныя паслугі. Атрымліваецца кругленькая сума. Ёсць выйсце — здымаць кватэру не аднаму, а з сябрамі. Аплата дзеліцца на колькасць наймальнікаў. Ды і жыць з сябрамі весялей.

Аднак суседзі могуць мець рознае стаўленне да вучобы. Галоўнае, каб суседства не перашкаджала вам рыхтавацца да заняткаў, добра адпачываць пасля вучобы. Здараецца, што ў вясёлай кампаніі, асабліва першакурснікі, губляюцца і забываюцца пра галоўныя мэты — добра вучыцца і стаць дыпламаваным спецыялістам. Таму запрашайце здымаць разам кватэру людзей, якіх вы добра ведаеце і ўпэўненыя ў іх сумленнасці.

ПРЫСТАНАК № 5.
РОДНАЯ ХАТА

Калі месца вучобы знаходзіцца недалёка ад месца жыхарства, то можна кожны дзень ездзіць дадому. Так робяць многія. Яны палічылі, што кошт праезду ў два бакі за месяц атрымліваецца меншы, чым кошт здымнага пакоя ці кватэры. Сорак хвілін — у адзін бок, сорак — назад. Затое грошы зэканомлены і на пражыванні, і на харчаванні (дома студэнта заўсёды чакае маміна ежа). Толькі вось штодзённыя «падарожжы» забіраюць шмат сілаў. А студэнту трэба і да заняткаў падрыхтавацца. «У гэтай справе галоўнае — звычка, — тлумачыць мне мой сябра. — Праз два тыдні «падарожжаў» я ўжо не адчуваў стомы».

Калі вы амаль першакурснік, не адцягвайце пошук жылля надоўга. Студэнт з дахам над галавой — удвая шчаслівейшы студэнт.

Жанна БАЙГОТ,
студэнтка ГрДУ імя Я. Купалы.

ЮРЫДЫЧНАЯ АДУКАЦЫЯ ПРЫЦЯГАЛЬНАЯ ДЛЯ МОЛАДЗІ

Фантастычны конкурс — 15,7 чалавека на месца — быў зарэгістраваны ў гэтым годзе ў Юрыдычным каледжы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта пры паступленні абітурыентаў на аснове базавай адукацыі: на 50 бюджэтных месцаў тут было пададзена 787 заяў. Летась конкурс сярод выпускнікоў базавай школы быў таксама высокім (13,5 чалавека) аднак меншым, чым сёлета. Прахадны бал для абітурыентаў-гараджан склаў 25,5 бала, а для выхаванцаў навучальных устаноў, размешчаных у сельскай мясцовасці — 24,1 бала (у 2008 годзе — 24,0 і 22,2 бала адпаведна).

Пры паступленні на аснове агульнай сярэдняй адукацыі на дзённую бюджэтную форму навучання было пададзена 126 заяў на 25 месцаў. Такім чынам конкурс перавысіў 5 чалавек на месца (у 2008 годзе на адно месца прэтэндавалі каля трох чалавек). Каб стаць студэнтам Юрыдычнага каледжа БДУ, гараджанам трэба было набраць у суме не менш як 221 бал, а абітурыентам з сельскай мясцовасці — 210 балаў (у мінулым годзе — 171 бал). Такім чынам і агульны конкурс, і прахадныя балы ў гэтым годзе даволі істотна выраслі...

Надзея НІКАЛАЕВА.

Гаспадары зямлі сваёй

Сем'і лушчылі гарох, ставілі бабку...

11 хвілін 42 секунды — менавіта столькі часу хапіла сям'і Грабко, каб на выдзеленым участку зжаць сярпамі жыта для 10 снапоў, звязаць іх і паставіць бабку. Пры гэтым не зарабіць ніводнага штрафнога бала, паколькі праца была выканана бездакорна, што пацвердзіла строгае журы ў асобе колішняга галоўнага агранома СВК «Пятроўшчына» Глыбоцкага раёна і мясцовых жыхарак. За гэта сям'я Грабко ўжо ў другі раз атрымала тытул, на гэты раз — «Гаспадар поля». Хоць, па праўдзе, практычна ўсім удзельнікам гэтага сельскагаспадарчага спаборніцтва было нялёгка: навыкаў працы з сярпом у іх не было. Таму напачатку давялося нават пад кіраўніцтвам спрактыкаваных суддзяў-вяскоўцаў праходзіць курс «маладой жняі», а ўжо толькі потым уступаць у спаборніцтва.

Прыкладна так праходзіў нядаўна адзін з апошніх этапаў раённага сямейнага сельскагаспадарчага праекта «Гаспадар зямлі» ў Глыбоцкім раёне, што ладзіцца ў рамках рэспубліканскага конкурсу «Уладар вёскі». Яго арганізатарамі выступілі мясцовы райкам БРСМ, раённая арганізацыя «Белая Русь» і ўпраўленне сельскай гаспадаркі і харчавання райвыканкама. Хоць насамрэч для Глыбоцкага раёна праект не новы — менавіта на яго тэрыторыі ён і нарадзіўся ў 2007 годзе (пра што, дарэчы, «Звязда» ў свой час шмат і падрабязна пісала).

Паспрабаваць свае сілы ў цяперашнім праекце вырашылі 7 сем'яў з розных гаспадарак раёна, распаўзяла нам першы сакратар Глыбоцкага райкама БРСМ Алеся Кашко. У прыватнасці, гэта сям'я Лук'янёнкаў з СВК «Залатая падкова», сем'і Падгол і Гарадзёнкаў з філіяла «Прошкава», сям'я Парфелюкоў з СВК «Пятроўшчына» (што выхоўвае пяцёра дзетак), сям'я Рачыцкіх з філіяла «Галубічы» (выхоўвае прыёмнае дзіця), вышэйназваная сям'я Грабко з ААТ «Глыбоцкая птушкафабрыка» (у сям'і выхоўваюцца 9 дзетак, яна мае статус дзіцячага дома сямейнага тыпу, да таго ж менавіта яны былі прызёрамі першага праекта «Уладар вёскі») і сям'я Дуровічаў з СВК «Салаўінае».

Удзельнікі праекта ўжо бралі ўдзел у конкурсе на лепшы падворак. Ён засведчыў, што ўсе сем'і зацікаўленыя ў добраўпарадкаванні прысядзібных участкаў, усе імкнуцца знайсці свой адметны стыль у афармленні тэрыторыі. Напрыклад, усё ў сям'і Дуровічаў мае сэнс: тры лебедзі на падворку сімвалізуюць уласна сям'ю, а дзве клумбы ў форме сэрцаў — каханне і разуменне ў ёй. Дом сям'і Грабко падобны на казачны церам — столькі ў ім дзіцячых работ, зробленых уласнымі рукамі з розных матэрыялаў. На вялікай тэрыторыі вакол жылля — мноства разнастайных сельскагаспадарчых культур. А яшчэ ў сям'і захапляюцца развядзенне курэй розных парод. Асаблівым каларытам вылучаецца падворак сям'і Падгол: побач з лазняй ёсць сажалка, дзе і пакупацца можна, і рыбку палавіць, велізарны камень упрыгожвае двор... Менавіта гэтыя ўдзельнікі і атрымалі тытул «Гаспадар сядзібы», другое месца заняла сям'я Лук'янёнкаў, трэцяе — Дуровічаў.

...А ці збіралі чытачы калі гарошак? Ну, той, салодкі, што расце ў агародзе? А на хуткасць і спрытнасць? Менавіта такія ўмовы былі пастаўлены перад удзельнікамі праекта падчас конкурсу «Цуда гарошак», які адбыўся на базе гаспадаркі «Азярцы» пры падтрымцы ААТ «Глыбоцкі кансервавы завод». На працягу 30 хвілін удзельнікі (а ў конкурсе, згодна з умовамі, бралі ўдзел мама, тата і адно дзіця) збіралі гарох, потым лушчылі яго. Пры гэтым улічвалася не толькі вага сабранага гароху, але і чысціня зборкі, чысціня тэрыторыі. Па выніках этапа, як потым высветлілася, не было роўных сям'і Грабко. Яна і атрымала тытул «Гаспадар агарода».

Дарэчы, усе сем'і па выніках кожнага этапа ўзнагароджваюцца каштоўнымі падарункамі і прадукцыяй прадпрыемстваў, на базе якіх праводзяцца спаборніцтвы і якія аказваюць поўную падтрымку сельскагаспадарчаму праекту. Натуральна, каштоўныя падарункі атрымліваюць і пераможцы этапаў. Дарэчы, раённая арганізацыя «Белая Русь» абвясціла сем'ям—удзельнікам гульні, што тыя з іх, хто да канца праекта аб'явіць пра будучае папаўненне сваёй сям'і, атрымаюць дадатковы каштоўны падарунак. Хоць, зразумела, для саміх удзельнікаў такія ўзнагароды — прыемнае, але не самае галоўнае. Па вопыту раней праведзеных праектаў можна сказаць, што самі ж гульцы найперш адзначаюць новыя знаёмствы, сяброўства, узаемападтрымку, што суправаджалі іх удзел у спаборніцтвах, а таксама пашырэнне кругагляду, вывучэнне гісторыі і традыцый сваёй мясцовасці, сваёй Радзімы, што ўжо важна для гэтых людзей і навакольных як для грамадзян сваёй краіны.

Сяргей РАСОЛЬКА.
Фота Алега ЛЕАНОВІЧА.

Беларусь археалагічная

У ВОЎЧЫНЕ ШУКАЮЦЬ ПАРЭШТКІ АПОШНЯГА КАРАЛЯ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ?

Студэнты Брэсцкага ўніверсітэта знаходзяць усё новыя артэфакты старажытнасці.

Чатыры гады таму ў сутаронніх Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта нарадзілася ідэя распачаць археалагічныя даследаванні невялічкіх пасёлкаў Брэстчыны. А пачаць раскопкі вырашылі з Воўчына — мястэчка амаль на мяжы з Польшчай. І зусім не выпадкова, бо менавіта тут былі пахаваны парэшткі Станіслава Аўгуста Панятоўскага — апошняга караля Рэчы Паспалітай. Так, сапраўды былі, бо дзесьці ў 1946 годзе падчас рабаўніцтва тамашняга касцёла яны зніклі разам з усім касцёлаўскім скарбам. Дзе яны цяпер, дакладна невядома. На гэтае пытанне паспрабавалі даць адказ археолагі-валанцёры, праўда, як высветлілася, у Воўчыне яны не толькі дзеля гэтага...

— Вы са «Звязды»?.. Ну, гэта ж святое! — вітае нас **спадар Аляксандр БАШКОЎ, дацэнт кафедры гісторыі славянскіх народаў Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта.** — Сядайце, пагутарым!..

І мы прыселі на прыступках старадаўняй пабудовы будучага музея з відам на агромністы касцёл і зялёную алею. Адразу захацелася даведацца, што гэта за раскопкі і чаму яны праходзяць дакладна ў гэтым месцы:

— Чацвёрты год мы ўжо праводзім комплекснае вывучэнне заходнебеларускага мястэчка, бо, у прынцыпе, такіх археалагічных даследаванняў у гэтым краі не праводзілася (былі толькі вывучэнні больш-менш буйных гарадоў). У нашым выпадку ёсць праграма аблвыканкама па стварэнні музея (што акурат месціцца за касцёлам. — **Аўт.**), а таму яны звярнуліся да нас, каб мы правялі тут комплексныя археалагічныя даследаванні. Працуюць у нас гісторыкі-студэнты Брэсцкага ўніверсітэта (я сам археолаг па спецыяльнасці), прычым, калі першакурснікі праходзяць тут вытворчую практыку, да нас прыязджаюць яшчэ і валанцёры — нашы выпускнікі, студэнты старэйшых курсаў, каб дапамагчы ў раскопках. Мы заклалі раскоп досыць вялікага маштабу ў іншым месцы (на захад адсюль) — і аказалася, што мы выйшлі на ўнікальныя захаваныя пласты XIV—XVII стст.: па сутнасці, пласты не кранутыя. І гэта нас настолькі зацікавіла, што мы сёлета вырашылі прыехаць і «дарэзацца»: іншымі словамі, закласці яшчэ адну раскопку, каб пашырыць плошчу даследаванняў... І бачыце, у нас тут ёсць цудоўная стратыкарта (напластаванні), дзе на сёння мы дайшлі з XX да XVIII стст.

— А ў чым унікальнасць атрыманых вынікаў?

— Справа ў тым, што ў нас у Беларусі наогул мала такіх вывучаных мястэчак, якія давалі б матэрыял менавіта гэтага перыяду, а тым больш на захадзе краіны. Па сутнасці, у заходняй частцы гэта адзінае мястэчка, якое вывучаецца так шырокамаштабна — калі падсумаваць, за гэтыя чатыры гады мы раскапалі дзесьці каля 200 метраў квадратных. І гэта шмат: асабліва па мерках невялічкага мястэчка! Варта сказаць, што і матэрыялы мы атрымалі таксама ўнікальныя (розныя старадаўнія манеты, гузікі і г.д. — **Аўт.**). Напрыклад, літаральна некалькі дзён таму мы знайшлі прускія манеты XVIII стагоддзя — гэта проста цуд, бо паказвае, колькі шыкоўна жылі ў Воўчыне...

— І не дзіўна, бо тут пахаваны апошні кароль Рэчы Паспалітай! Ці не падзеліцеся, як ідзе пошук дакладнага месца пахавання?

— Ну, нашай задачай не з'яўляецца шукаць парэшткі караля, бо ў 1946 годзе тут разрабавалі касцёл і выкінулі ягоныя парэшткі з труны. Па сутнасці, спаганілі і святыню, і нябожчыка, якую б ролю ён ні адыграў у гісторыі (хоць гэта чалавек-эпоха, пра якога расказваюць ва ўсіх падручніках)... Але цяпер мы вывучаем гэты матэрыяльчык і ў нас накопліваецца агромністы патэнцыял вывучэння матэрыяльнай культуры. На сёння, можна сказаць, што мястэчка, хоць і ўзгадваецца толькі ў XV стагоддзі, з'яўляецца трошкі старэйшым, бо мы знайшлі артэфакты большай гісторыі — гэта першае. Па-другое, мы вывучаем тапаграфію Воўчына: дзе яно ўзнікла і як яно пашыралася, развівалася — тут мы ўжо таксама зрабілі пэўныя высновы і, дэ-факта, сцвярджаем...

— І як вынік...

— Як вынік, трэцяе: увесь сабраны матэрыял стане паказальным у плане вывучэння заходнебеларускага мястэчка. Яшчэ раз падкрэсліваю, у нас не было такіх шырокамаштабных местачковых раскопак — местачковай культуры не ведае ніхто! А таму наша задача цяпер — сабраць гэты матэрыял, апрацаваць яго, увесці ў навуковы абарот: ёсць ужо некаторыя публікацыі (справаздачныя. — **Аўт.**). Мы спадзяёмся, што вынікам нашай працы стане выданне манаграфіі па гісторыі Воўчына, і ў прыватнасці, акцэнт будзе пастаўлены не толькі на дакументальныя крыніцы, але і на археалогію. Так што будзем працаваць!..

Раскопкі працягнуцца, як мінімум, яшчэ адзін тыдзень. Не таму, што няма чаго шукаць, а таму, што раскопкі ідуць адна за адной, кожны раз на новым аб'екце — наступным крокам будзе Бяроза-Картузская, дзе плануецца ўзнавіць уязную браму...

ПАРАЛЕЛЬНА

Ідуць раскопкі ў мястэчку Пагранічнае, дзе таксама брэсцкія гісторыкі-студэнты спрабуюць адшукаць паселішча і могільнік эпохі жалеза. Магчыма, тамашняе паселішча будзе знойдзена, паколькі пэўныя гістарычныя дакументы сведчаць менавіта аб яго наяўнасці.

СВЕДКІ ЗНІКНЕННЯ ПАРЭШТКАЎ КАРАЛЯ, МАГЧЫМА, ЯШЧЭ ДАПАМОГУЦЬ ГІСТОРЫКАМ

Калі карэспандэнты «Звязды» толькі прыехалі ў Воўчын ды яшчэ аглядаліся на імправізаванай плошчы ля касцёла, да мяне падышоў нейкі мясцовы жыхар.

— Вам нічога не вядома пра касцёл? Ці збіраюцца яго рэканструяваць? — спытаўся я.

— Ну, касцёл... У ім быў пахаваны кароль Рэчы Паспалітай! Памятаю, як гадзіннік на вежы біў — у полі чуваць было нават за некалькі кіламетраў, магчыма... Але ж я малым быў, неразумным: толькі ў першы клас пайшоў...

— Ці не ведаеце, што здарылася з каралём?

— Хлопец, разумееш, я малым быў!! Вежа так прыгожа біла... Але, потым 46-ы год і... Ай! — махнуў рукой спадарожнік. — Хоць я зараз і не цвярозы, але раю не паўтараць нашых памылак, — сказаў на развітанне ён, абарочваючыся яшчэ разы чатыры, пакуль не знік за павароткам.

І я зразумеў, што, магчыма, гэтая «нецвярозасць» некалі дапаможа адшукаць парэшткі Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Цяпер жа я цалкам упэўнены, што сляды апошняй магілы апошняга караля трэба шукаць у мясцовых старажылаў...

Мікола ТАМАШЭВІЧ.
Фота Аляксея КУЛЬБІЦКАГА.

Такія прускія манеты XVIII ст. нядаўна знайшлі ў Воўчыне падчас раскопак.

НАША ДАВЕДКА

Станіслаў Аўгуст Панятоўскі нарадзіўся ў Воўчыне 17 студзеня 1732 года. Доўгі час быў палюбоўнікам расійскай імператрыцы Кацярыны II і пры падтрымцы прарасійскіх сілаў уступіў на Вялікае княжанне ў 1764 годзе. За час кіраўніцтва адзначыўся ў гісторыі як ліберал-рэфарматар, давёўшы, аднак, Рэч Паспалітую да канчатковага крызісу і паступовага паглынання суседнімі дзяржавамі. Нягледзячы на гэта ў 1791 годзе з ягонай згоды ўводзіцца ў дзеянне Канстытуцыя (другая ў свеце), якая была заклікана ўмацаваць дзяржаву. Але было ўжо позна — дзякуючы існаванню прарускіх і прапрускіх груповак (канфедэрацый), а таксама вайсковай сілы Панятоўскі перастаў быць каралём і Вялікім князем 24 кастрычніка 1795 года, калі, згодна з Пецярбургскай дэкларацыяй, Рэч Паспалітая была канчаткова падзеленая між Расіяй, Прусіяй і Аўстрыяй.

Станіслаў Панятоўскі да канца жыцця жыў у Пецярбургу, дзе і памёр 12 лютага 1798 года. У 1938 годзе па загадзе Сталіна парэшткі былі вывезены з Ленінграда ў Польшчу ў якасці добрасуседскага знака, аднак палякі на той момант лічылі Панятоўскага здраднікам, а таму адмовіліся прымаць нябожчыка ў краіну. З-за гэтай прычыны было прынята рашэнне пахаваць парэшткі недалёка ад мяжы — месцы, дзе нарадзіўся апошні кароль. У 1946 годзе воўчынаўскі касцёл святога Станіслава быў разрабаваны, а самі парэшткі Панятоўскага зніклі разам са скарбам.

СЁННЯ
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Вяртаючыся да надрукаванага

І ЗНОЎ ПРА САДКІ...

Прачытала ў «Чырвонцы» за 24 ліпеня матэрыял «Дзіцячы садок. Плюсы і мінусы», і напаўзло сваё, набалелае. Хачу падзяліцца ўласнымі думкамі наконт дзіцячага садка. А мо, хто і з чытачоў мяне падтрымае, ці які чыноўнік прыслухаецца да маіх меркаванняў...

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

А МО ЎЗАКОНІМ ПАБОРЫ?

«Колькі можна драць з нас грошай? На крэслы, на канапу, на дыван, на падлогу, на цацкі, на кубкі, на магнітафон, на раздатачны матэрыял, на кніжкі, — гэта ўжо не кажучы пра тое, што мы рамантуем памяшканне і фарбуем абсталяванне на пляцоўцы, дзе гуляюць дзеці...», — злуецца «калега», чыё дзіця ходзіць у садок разам з маім старэйшым сынам. Год таму я з такім жа імпэтам «разносіла» б сваю дзіцячую ўстанову. Але цяпер, наадварот, пачынаю абараняць сістэму добраахвотных ахвяраванняў. Проста, маё малодшае дзіця таксама стала садкоўскім, вось толькі ходзіць яно ва ўстанову, дзе няма такіх «лютых» пабораў. А мо лепш былі б?..

Мой старэйшы ходзіць у санаторны садок, які ў раёне лічыцца «крутым». Калі я забіраю яго, мамкі, якія пакуль сядзяць ў «дэкрэце», цікавяцца: «А колькі вам каштавала сюды ўладкавацца? Ці праўда, што, каб прынялі сюды дзіця, трэба не менш чым 300 долараў?» Грашовы ўнёсак, безумоўна, — чуткі. Але калі на размове з загадчыцай садка чуеш, «а чым вы можаце нам дапамагчы», бацькам мімаволі прыходзіцца нешта рабіць для дашкольнай установы. Дзелавы падыход загадчыцы адбіваецца на ўстанове: кожную вясну, калі ідзе набор дзяцей у групы, тут з'яўляецца нешта новае. У гульнявых пакоях хапае цацак, малыя гуляюць на коўдрах, а не на голай падлозе, добра абсталяваны спартыўная і музычная залы, на вуліцы прыгожыя пляцоўкі. Педагогі адпрацоўваюць з малымі па поўнай праграме — штодзень дзеці нам дэманструюць свае малюнкі і вырабы, расказваюць, пра што новенькае ім сёння распавядалі.

А вось маё малодшае дзіця ходзіць у звычайны садок. Дзецям не хапае нават кубікаў, каб выхавальнікі з імі маглі праводзіць заняткі па канструяванні, бацькоўскі камітэт спецыяльна збіраў грошы на цацкі, бо ў групе амаль не было машынак і лялек, на вуліцы ў ясельнай групы — аблезлая нязграбная пясочніца, без борцікаў, малым, ад таго, што няма дзе прысесці, даводзіцца проста плюхацца на пясок. А ў шафе з дзіцячай вопраткай, калі я прыходжу па дзіця, перыядычна знаходжу запіскі, ад мам-актывістак: «Калі ласка, здайце грошы на пячэнне, бо малыя просяць у выхавальніц». Глядзіш на меню — і становіцца шкада дзяцей — тут не даюць садавіну, салатаў, булачак, амаль не бывае сокаў і кісламалочных прадуктаў. На вячэру — голая каша і маленькі кавалачак батона, а то і наогул — вінегрэт з гарбатай.

Амаль усе мамы, які водзяць сюды сваіх малых, скардзяцца, што забіраюць дзяцей галоднымі. Пастаянна не хапае выхавальнікаў і нянек, часам з пляймай дзетак прыходзіцца вазіцца аднаму чалавеку. А ў выніку і дзеці не дагледжаныя, і на выхаваўчыя заняткі нестае часу. Спецыяльна ўзяла праграму «Пралеска» і прагледзела, чым павінны былі займацца з маім дзіцём. За год у групе толькі разы са тры былі заняткі з пластылінам, кардон і каляровая папера наогул у малога не кранутыя. А як балюча, калі малое заяўляе: «Я туды не пайду, мяне там ніхто не любіць».

Безумоўна, я забяру сваё дзіця адсюль і буду прасіцца ў санаторны садок, тым больш, што пасля «садкоўскага хлеба» ў медкарце майго дзіцяці якіх толькі хваробаў не пабывала — ад бранхіту да пнеўманіі і гастралітыту. Паборы мяне ўжо не пужаюць. Я наадварот толькі «за». Абы маё дзіця было здаровым і шчаслівым.

Няхай з-за гэтага вырасце плата за дзіцячы садок, але калі бацькі ўбачаць, што ўсё на карысць іх дзіцяці, яны не будуць абурацца. Хтосьці можа мне запярэчыць, што плата за садок вялікая, куды ж яшчэ павышаць. Але не думаю, што такіх людзей будзе шмат. Напрыклад, у групе, куды ходзіць маё малодшае дзіця, амаль усе бацькі яшчэ аплачваюць дадаткова 30 тысяч за тое, каб іх малыя займаліся ў развівальным гуртку пры садку. А хіба ж яны пашкадуюць на ежу для сына ці дачкі? А можа з-за таго, што асобным мамам шкада грошай на ўласнае дзіця, трэба не дакормліваць і пакідаць без вітамінаў усю групу? Прынамсі, не толькі ў маім садку, але і ў многіх іншых мамы носяць сваім малым «сабойкі», хоць гэта і забаронена санстанцыяй. Мая сяброўка спецыяльна цягала ў садок торбы з уласнымі яблыкамі з дачы, на ўсю групу, маўляў, «маё будзе есці, але і іншым дзеткам захочацца вітамінчыкаў». А мо ёсць сэнс вырашаць праблемы з дзіцячым харчаваннем на больш цывілізаваным ўзроўні, а не перабівацца «сабойкамі»?

Калі немагчыма ўсе садкі зрабіць санаторнымі з пяціразовым харчаваннем і пэўнымі прафілактычнымі паслугамі, можа, ёсць сэнс увесці ў дашкольных установах санаторныя гурткі, дзе за дадатковыя грошы па жаданні бацькоў іх дзеці змогуць піць фітачаі, сокі і праходзіць пэўныя аздараўленчыя працэдуры. Асабіста я б на такі гурток раскашэлілася, прафілактыка мне ўсё роўна абыдзецца танней, чым лячэнне. За месяц маё малое прыносіць з садка па 2-3 заразы, і на антыбіётыкі і іншыя лекі я трачу каля 100 тысяч.

Прынамсі, звычайны садок мне абыходзіцца не танней, чым санаторны. Тут бацькі таксама хочуць стварацьдля дзяцей добрыя ўмовы — бацькоўскі камітэт збірае грошы то на цацкі, то на дываны, то на ўпрыгажэнні групы да свята, то на новыя шпалеры.

А мо ўзаконім паборы?

Ганна ДАШКЕВІЧ.

Бацькі і выхавальнікі: супрацьстаянне ці супрацоўніцтва?

Мы часта наязджаем на выхавальнікаў: то дзяцей не даглядзелі, то песенькі не развучылі, то чытаць не навучылі, ці то проста мала аддалі ўвагі нашаму сыночку ці дачушцы. А што мы можам зрабіць, каб змяніць сітуацыю.

ХТО КАМУ?

Сапраўды бывае такое, што выхавальніца проста не паспявае займацца з дзецьмі. То хварэюць яе зменшчыца ці няня, то трэба да ранішнікаў маляваць плакаты, то група папоўнілася новымі выхаванцамі, якія ўвесь час рыдаюць, кліючуць маму і не злазяць з рук выхавальніцы, то хто з малых прыхварэе і трэба сядзець ля яго, пакуль не падаспее маці. А то і бацькоўскі камітэт перакідвае на выхавальнікаў ролю бухгалтара, які збірае грошы на падарункі дзецям. Натуральна, што план мастацкіх заняткаў, які прапісаны ў садку, з-за гэтага зрываецца. Калі раптам у вашым садку нешта не так, не спяшайцеся ладзіць разборкі. Высветліце, чаму так адбываецца, а раптам менавіта ваша дапамога дазволіць разгрузіць выхавальніка, каб ён у сваю чаргу мог больш увагі аддаць дзецям.

Пазіцыя «што вы зможаце зрабіць для майго дзіцяці» замест «што магу зрабіць я» іграе не на карысць дзіцяці, упэўнены супрацоўнікі Мінскага абласнога інстытута развіцця адукацыі. На выхавальніка ідзе вал нараканняў ад бацькоў, разабрацца з гэтым і дагадзіць усім даволі складана. Так, дзіцячая ўстанова павінна стварацьумовы для развіцця дзіцяці, што закладзена ў дзяржаўную праграму «Пралеска». Але тое, якія будуць створаны для гэтага ўмовы, залежыць ад многіх фактараў: ад узроўню прафесіяналізму супрацоўнікаў садка, ад укамплектаванасці ўстановы адпаведнымі кадрамі, ад адносінаў да яе, як саміх бацькоў, так і грамадства ў цэлым, нізкія заробкі таксама могуць негатыўна адбівацца, у выхавальніка няма матывацыі на тое, каб выходзіць у сваёй працы на больш высокі ўзровень. Сёння гэта адна з самых нізкаплатных прафесій: выхавальніку без катэгорыі, які толькі пачынае працаваць у дзіцячым садку, належыць усяго каля 300 тысяч рублёў. У горадзе і ў вёсцы матэрыяльнае забеспячэнне садкоў можа розніцца, бо бюджэты рэгіёнаў неаднолькавыя, ўсё залежыць ад эканамічнага патэнцыялу, умоў, у якіх рэгіёны знаходзяцца.

Часта ў працы выхавальніка шмат заарганізаванасці, на іх навальваецца папяровая работа, якой яны не павінны займацца. Міністэрствам адукацыі прапісана неабходная дакументацыя выхавальніка, гэта 3-5 дакументаў, галоўны з якіх — план работы, але разнастайныя кіраўніцкія ўстановы патрабуюць ад садкоў бясконцых справаздач. У выніку дзеці пазбаўляюцца ўсяго таго, што выхавальнік мог бы ў іх укласці, калі б не разбіраўся з неабходнымі паперкамі.

«Праблема яшчэ ў тым, што бацькі не разумеюць, што ў дзіця трэба ўкладваць і свае сілы», — заўважае **старшы выкладчык кафедры дашкольнай адукацыі Мінскага абласнога інстытута развіцця адукацыі Таццяна КНЯЗЕВА.** Калі мамы і таты не будуць аддаваць увагі сваім малым, многія садковыя напрацоўкі не дадуць карысці. Напрыклад, усё больш у дзіцячых садках укараняецца тэхналогій па захаванні здароўя, без гэтага не выгадна працаваць, бо дні, прапушчаныя дзецьмі з-за хваробаў, — гэта страчаныя грошы, заробкі. «Сэнсу не будзе ад загартоўвання ў садку, калі гэтага няма дома, — заўважае Таццяна Канстанцінаўна. — Што значыць, калі ў садку гавораць пра шкоду курэння, а дома дзіця бачыць, як тата атрымлівае задаваленне ад цыгарэты».

КАПІТАЛ — ДЗЕЦІ

Даволі часта можна чуць водгукі аб садках накшталт «там толькі грошы выцягваюць». Мы крыўдуем, што трэба раскашэліцца, але не заўважаем, на што. «Сёння змяніліся запыты грамадства, бацькі хочуць даць дзіцяці ўсебаковае развіццё, хочуць, каб садок працаваў па новых тэхналогіях. А для гэтага патрэбны якасныя дыдактычныя матэрыялы, прынады, цацкі, якіх не было раней. За частку дадатковых паслуг, за лепшыя ўмовы фактычна павінны плаціць бацькі, дзіцячыя ўстановы ствараюць рынак паслуг. Напрыклад, бацькі не шкадуюць грошай на рэпетытараў, каб падрыхтаваць сваіх сыноў і дачок да паступлення ў ВНУ, а якасная дашкольная адукацыя таксама патрабуе сродкаў», — кажа **метадыст вышэйшай катэгорыі Мінскага абласнога Інстытута развіцця адукацыі Надзея КАМАЕД.** Паразуменне таго, што не ў садок, не ў школу ўкладваюцца грошы, а ў дзяцінства, пакуль прыйшло не да кожных бацькоў.

ШТО РАБІЦЬ?

Калі вы хочаце ведаць, чаго і колькі павінен даваць вашаму малому дзіцячы садок, можаце азнаёміцца з нацыянальнай праграмай дашкольнай адукацыі «Пралеска», мэта якой — гарманічнае ўсебаковае развіццё дзяцей (а гэта не толькі заняткі мастацкай, музычнай, спартыўнай дзейнасцю, але і многае іншае). Дарэчы, у садку вісіць расклад заняткаў, якія павінны праводзіцца з дзецьмі рознага ўзросту.

Але калі ваша дзіця адразу не выдае энцыклапедычных ведаў пасля вяртання з садка, гэта не значыць, што выхавальнікі з ім не займаліся. Магчыма, малы не можа ці не хоча дзяліцца з бацькамі. Калі вы паназіраеце за ім збоку, магчыма, адкрыеце для сябе шмат цікавага. Дзяўчаткі ціхенька спяваюць песенькі і чытаюць вершыкі садкоўскага рэпертуару сваім лялькам. Дзеці лечаць мішак, «гатуюць», «мыюць», «рамантуюць», пачынаюць збіраць пазлы, скакаць на адной ножцы і гуляць з мячом, маляваць нейкія фігуркі. На жаль, многія бацькі не разумеюць, што гэтым звычайным рэчам іх малых навучыў садок. Бывае такое, што бацькі заніжаюць заслугі выхавальнікаў. Напрыклад, маці аднаго хлопчыка дзеліцца, што яе сын — вундэркінд, умее выдатна лічыць. На заўвагу выхавальніка, што гэта дзякуючы заняткам у садку, маці рэагуе: «А не смяшыце, ну чым вы тут займаецеся». «Ёсць устаноўка ў бацькоў, што калі дзеці сядзяць за сталамі, значыць з імі займаюцца. А калі выхавальнік з імі гуляе на падлозе — гэта свавольства. Але ў кожнай гульні ёсць пэўная мэта, гэта працуе на дзіця», — заўважае Надзея Камаед.

Пацікаўцеся, чым вы можаце дапамагчы. Узяўшы на сябе немудрагелістыя даручэнні: адрамантаваць цацку, перамыць вопратку садкоўскіх лялек, выразаць дэталі для аплікацыі, назбіраць шышак для заняткаў малых ці штосьці падобнае, вы дасце выхавальніку дадатковы час для заняткаў з дзецьмі. А з якой гордасцю ваш малы будзе хваліцца сваім сябрам, што гэта яго мама ці тата так пастараліся. Супрацоўніцтвам з садком, а не супрацьстаянне вы зможаце значна большага дабіцца для свайго дзіцяці.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Эсэ

Акварыум для Сенекі

Не люблю пасля працы заходзіць у крамы, асабліва ў вялікія. Там заўсёды процьма людзей, адна частка якіх спяшаецца дадому, а іншая, наадварот, не спяшаецца і бавіць час за вычытваннем цэтлікаў і разгляданнем жывой рыбы ў акварыумах. Рыбіны ў сваю чаргу разглядаюць людзей з-за тоўстага шкла. У іх задуменна-філасофскі позірк. І наогул, у нечым яны нагадваюць старажытных стоікаў. Вунь тая, збоку, што варушыць доўгімі вусамі, ну проста Сенека. Цікава, Сенека меў вусы? Рыбіна глядзіць на мяне так, што я пачынаю заўважна мізарнець, а паліто датыкаецца слізкай падлогі, скрозь пакрытай хвалямі ржавага бруду: на вуліцы адліга.

— Ну і чаго ты тут стала? Кошты на рыбу павысілі з гэтага тыдня! І наогул, ты за малаком прыйшла, забылася? А малочны аддзел зусім і не з гэтага боку.

— І няма чаго мяне вучыць! Хачу і стаю.

Я падцягнула паліто і выпрасталася.

— Між іншым, ты — звычайная рыбіна, хоць і вусатая, а я пакупнік, і маю ўсе правы стаяць тут і выбіраць.

— Эге-е, і не думай нават! Пакупніца знайшлася — з пустым кошыкам і гаманцом. У цябе да заробку два тыдні яшчэ, а чым ты мяне будзеш карміць? І ўлічвай тое, што марскую капусту я не ем!

— А няма чаго зазіраць у мой кошык, я і не збіралася нават карміць цябе сваёй улюбёнай марской капустай з карэйскай морквай.

— Фі, карэйская морква, як заезджана і безгустоўна! Скажы яшчэ, што прынясеш мяне дадому і засмажыш на гарачай патэльні жыўцом! Ты хоць ведаеш, што бывае са страўнікам пасля свежай рыбы з малаком?

Гэта праўда: я ніколі у жыцці не змагла б нікога засмажыць жыўцом. І я насамрэч зайшла ў краму па малако, для ранішняй кавы. Засталося пакорліва пайсці ў напрамку малочнага аддзела крамы, хаваючыся ад брудных пырскаў (падлога слізкая) і чужых локцяў за спінаю свайго лёсу, які час ад часу азіраўся і мармытаў сам сабе: «І правільна, і малайчынка вось. Лепш сама ідзі, а то цягнуць цябе нешта няма ніякай ахвоты. І падлога слізкая: адліга, сама вось бачыш».

А яшчэ цікава чакаць сваёй чаргі да касы. Можна вывучаць вітрыны з цукеркамі, чыпсамі і шакаладнымі батончыкамі, сярод якіх немаведама як апынуўся глазураваны сырок з вішняю, а можна цішком разглядаць людзей у чарзе. Адразу за мною стаіць аўтэнтычна-вясковага выгляду бабуля. На ёй сапраўдны кажух, ён пахне сенам і авечым сырам, на нагах валёнкі, а галава завязаная чырвонай квяцістаю хусткай. У руках бабуля трымае пластыкавую скрынку фаршыраваных смаўжоў, пакецік з квашанай капустай і салодка сама сабе ўсміхаецца. Перада мною — італьянец. Ён відавочна мерзне, захутаны ў даўжэзны шалік з растрапанымі кутасамі, перабірае нагамі ў густоўных, але затонкіх чаравіках з бліскучай скуры нейкай экзатычнай жывёліны і раз-пораз кашляе. Касірка якраз выбівае італійцу чэк на замарожаную лазанню і тры пачкі спагеці розных гатункаў і нават рознага колеру. Адзін з іх мае рамантычна-вясновую назву «птушыныя гнёзды». Я адразу ўяўляю, як цудоўна прыйсці дадому, адкрыць такі пачак, вытрасці кірпатыя пёркі і леташнія травінкі, можа, знайсці ў адным з гняздзечкаў смарагдавую завушніцу... А пасля варыць гнёзды ў падсоленай вадзе і дыхаць водарам ракі і лесу, і змлі пасля дажджу, і яшчэ чагосьці такога вясноваяўлоўнага. Італьянец, міркуючы па ўсім, таксама ўяўляе сабе нешта падобнае, і толькі мерна ківае галавою ў такт сваім думкам.

Нарэшце касірка выбівае і мне чэк.

— Пакет патрэбны?

Чымсьці яна нагадвае акторку з нямога кіно пачатку мінулага стагоддзя: слоў не чуваць з-за гучнай музыкі і гоману натоўпу, можна толькі чытаць па вуснах, затое якая выразнасць у твары і ва ўсіх рухах!

— А можна мне, гэта, для яго пакет, з вадою каб...

Касірка аглядае мяне з трагічным разуменнем, прыўстае і, спрабуючы перакрычаць увесь крамны вэрхал, падае рэпліку кудысьці за кулісы:

— Гааляў!

— Агась!

— Прынясі там яшчэ, ну ты ведаеш...

Паглядзеўшы на мяне яшчэ раз, дадала:

— І водарасцяў пакладзі гэтых, што засталіся з учорашняга завозу, няхай ужо!

Працягваючы пакунак ды зноў зазіраючы мне ў самыя вочы, прамовіла:

— Вы яму часта есці не давайце, раз на дзень дастаткова будзе. Я вам тут напісала на чэку адрас: там крама, недалёка зусім ад метро, і корм у іх таннейшы, чым дзе.

Нарэшце, выходжу з крамы і накіроўваюся дамоў, у адной руцэ заціснуты квіток з адрасам, у другой — вялізны пакет, запоўнены вадою і для надзейнасці абгорнуты маім шалікам. Пачынае марозіць. Я шчыльней захінаюся ў паліто і пытаю:

— Сенека, яна сказала цябе раз на дзень карміць. Гэта нічога, што я цябе клічу Сенекам?

Ён хітра ўхмыляецца сабе ў вусы і падкрэслена абыякава кажа:

— Ну кліч, што ж зробіш. А ванна у цябе ёсць? З душам?

— Я падумала, табе ночваў хопіць... А што — не?

— Ну няхай ужо, а што ж... І пра капусту не шкадуй, я чуў, прадавачкі казалі, што яна нясмачная нейкая ўдалася. Няхай ужо... Esse spectaculum dignum, ad quod respiciat intentus operi suo deus*...

Заўтра ізноў давядзецца піць каву без малака.

Юлія ШЭДЗЬКО.

** Вось відовішча, вартае таго, каб на яго азірнуўся Бог, сузіраючы сваё стварэнне.*

Дзяніс ДАЛІДОВІЧ:

«МАЯ ЛЮБОЎ — ХАКЕЙ...»

Пра такую спартыўную кар'еру, як у юнага хакеіста Дзяніса Далідовіча, мараць многія. У свае 16 гадоў капітан сталічнай каманды «Юнацтва—Мінск-1993» тройчы быў прызнаны лепшым гульцом, забіў больш за сотню шайбаў у вароты супернікаў, атрымаў запрашэнне ад дырэктара хакейнай школы «Nothern Edge» Крэйга Вудкрафта трэніравацца ў Сент-Луісе. Год таму юнаку прапанавалі гуляць і вучыцца ў хакейным каледжы «Сент-Мэры», што ў амерыканскім штаце Мінесота. А яшчэ нядаўна Дзяніса запрасілі на зборы ў зборную Беларусі U18. У складзе юніёрскай зборнай ён прыме ўдзел у чэмпіянаце свету па хакеі сярод юніёраў, які пройдзе ў красавіку 2010 года ў Беларусі.

Нядаўна Дзяніс Далідовіч прыехаў у Мінск на канікулы. Але тут хлопцу не да адпачынку. Кожны дзень юнага хакеіста літаральна распісаны па хвілінах: трэніроўкі, зборы, гульні на лёдзе... Нашаму карэспандэнту ўдалося пагутарыць з маладым спартсменам.

— Дзяніс, як ты трапіў у хакейны каледж «Сент-Мэры»?

— Гэты каледж лічыцца адным з лепшых у Паўночнай Амерыцы. Ён знаходзіцца ў горадзе Фарыболт у штаце Мінесота. А трапіў я сюды дзякуючы міжнароднаму трэніровачнаму кэмпу «Nothern Edge», які штогод праводзіць федэрацыя хакея Беларусі. Мяне заўважылі трэнеры з Канады. Яны і прапанавалі адправіцца за акіян.

— Адразу адчуў розніцу паміж хакеем Беларусі і ЗША?

— Першы час мне, прызнаюся, было вельмі нязвыкла на новым месцы. Тым больш, у амерыканскім хакеі сапраўды ўсё зусім па-іншаму, чым у нас. Па-першае, там лядовыя пляцоўкі меншыя, шмат увагі надаецца тактыцы. За сілавы прыём там адразу не выдаляюць з лёду на лаўку штрафных, як у нас.

— Твой пераезд у іншую краіну, як я разумею, не азначаў расставання з Радзімай?

— З беларускім хакеем я не развітаўся. Працягваю гуляць і трэніравацца ў клубе «Юнацтва». У мяне не было мэты з'ехаць назаўсёды за мяжу. Вопыт гульні ў замежнай школе мне вельмі спатрэбіцца. Калі ехаў у ЗША, хацелася перш за ўсё паглядзець, як там наладжаны хакей, аб якім я раней ведаў толькі па чутках і, безумоўна, атрымаць пэўныя навыкі і хакейнае майстэрства. Хачу трапіць у нацыянальную камандзе. Мне важна, у першую чаргу, прадстаўляць Беларусь... Для гэтага буду рабіць усё магчымае, а галоўнае — працаваць над сваім узроўнем.

— А ці не перашкаджае спорт тваёй паспяховасці ў вучобе?

— У каледжы «Сент-Мэры» ёсць адна важная ўмова: трэба паспяваць не толькі ў хакеі, але і ў вучобе. Калі ты дрэнна вучышся, то цябе проста не дапускаюць да трэніровак. З паспяховасцю ў мяне ніколі не было праблем. Мой сярэдні бал у мінскай гімназіі № 7, дзе я вучыўся, складаў 8,3. Вучнем я заўсёды быў спакойным. З прадметаў больш за ўсё любіў фізічную культуру (смяецца).

— Як ты адпачываеш, калі ёсць вольны час?

— Дыскатэкі, шумныя вечарынкі — гэта не для мяне. Не люблю вялікія зборышчы людзей. Адпачываю звычайна дома. Бяру клюшку, працую над тэхнікай, трэніруюся ў забіванні шайбы. У мяне на першым месцы цяпер хакей, ні аб чым іншым не думаю. Калі я не буду трэніравацца, працаваць над сваім майстэрствам, то не будзе станоўчага выніку.

— Твайму поспеху, пэўна, зайздросцяць многія аднагодкі.

— Зайздрасці з боку сваіх сяброў, знаёмых не заўважаю. Няма часу думаць пра такія рэчы, па праўдзе кажучы. Яшчэ многія часта здзіўляюцца, што ў мяне няма «зорнай хваробы». Я не разумею, чаму яна павінна быць у мяне. Мне яшчэ працаваць і працаваць...

— Бацька да гэтай пары падтрымлівае цябе ў хакеі?

— Падтрымліваюць і мама і тата, за што я ім вельмі ўдзячны. Яны нават прыляталі на мае гульні ў ЗША. Тата ведае, што для мяне спорт на першым месцы. Ён наведвае ўсе турніры, дзе я ўдзельнічаю. У дзяцінстве ў мяне неяк адбыўся адзін забаўны выпадак. Я выйшаў на лёд і не вельмі добра згуляў матч. Пасля бацька запытаўся, чаму я не выкладаўся па максімуме ў гульні. На што быў мой бестурботны адказ, што ў мяне проста не было настрою (смяецца). Тады ён пагаварыў са мной па-мужчынску (смяецца) і з таго моманту для мяне няма нязначных гульняў.

— Ці лёгка было прывыкнуць да новага жыцця за акіянам? Як падтрымліваеш сувязь з роднымі, сябрамі?

— Першы час было нялёгка. Але паступова я прывык. Мяне здзіўляюць амерыканцы. Яны вельмі гасцінныя і пастаянна ўсміхаюцца. У Мінску не часта ўбачыш на вуліцах людзей з усмешкамі на тварах. Што датычыцца ежы, то ў ЗША ўсё ненатуральнае. З роднымі кантактую амаль кожны дзень праз інтэрнэт па скайпе. Гэта вельмі зручна. Падчас такіх стасункаў мне нават здаецца, што бацькі не на іншым кантыненце, а дзесьці побач са мной.

— Што ты параіш тым, хто таксама хоча дабіцца поспеху ў хакеі?

— Калі гэты від спорту падабаецца, то, безумоўна, трэба шмат працаваць над сабой і займацца ім. Ёсць шмат хлопцаў, якія гуляюць на лёдзе толькі дзеля грошай. Пры такім падыходзе поспеху не атрымаеш ніколі. Хоць тыя, хто па-сапраўднаму захоплены лядовай гульнёй, заўсёды дасягаюць пастаўленай мэты. Асабіста я гуляю з любові да хакею....

Гутарыла Аксана КОЗІНАВА.

г. ВИТЕБСК 01.09.2009

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С УСТАНОВЛЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ, РАВНОЙ ОДНОЙ БАЗОВОЙ ВЕЛИЧИНЕ, И ОДНОВРЕМЕННОЙ ПРОДАЖЕЙ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

№ лота	Наименование предмета аукциона	Характеристика предмета аукциона	Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей	Сумма задатка, рублей
1.	Не завершенное строительством не законсервированное капитальное строение – станция очистки сточных вод, расположенное по адресу: Витебская область, г. Барань, ул. Набережная, 1, и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта: дата начала строительства: 10.1986; площадь застройки: 1458 кв.м, общая площадь – 3 64,75 кв.м, общая степень готовности: 59,95 %; в т.ч. фундаменты – 100 %, стены – 85 %, перекрытия – 95 %, кровля – 90 %, полы – 20 %, проемы – 20 %. Земельный участок с кадастровым номером 242450200002000451, площадью 0,4766 га, срок аренды 50 лет. Использование земельного участка для обслуживания здания производственно-складского назначения. Ограничения в пользовании земельным участком в связи с его расположением в водоохранной зоне вне прибрежной полосы реки Адров и в охранной зоне линий электропередачи напряжением свыше 1000 В.	12 378 280	1 237 828
2.	Не завершенный строительством объект – завод глиняного кирпича, расположенный по адресу: Витебская область, Чашникский район, Лукомльский с/с, северо-западнее д. Стражевичи, и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объекта недвижимости: не завершенный строительством объект – завод глиняного кирпича. Земельный участок: с кадастровым номером 225183012101000094, площадь 26,3065 га для использования под производственную базу, срок аренды 99 лет. Назначение – для использования под производственную базу.	31 670 107	3 167 010

ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. Правды, 38, контактный телефон в Витебске: (0212) 47 60 96, сайт www.fondgosim.vitebsk.by, E-mail:votfondgi@tut.by.

ПРОДАВЕЦ ОБЪЕКТА НЕДВИЖИМОСТИ: **Лота № 1** – Республиканское производственное унитарное предприятие «Лёс», контактный телефон в г. Барань (0216) 25 38 39; **Лота № 2** – Дирекция строящегося государственного предприятия «Завод глиняного кирпича», контактные телефоны: (02133) 3 13 33, 3 76 37.

АРЕНДОДАТЕЛЬ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА: **Лота № 1** – Оршанский городской исполнительный комитет, **Лота № 2** – Чашникский районный исполнительный комитет.

Условия продажи единого предмета аукциона:

по Лоту № 1:

– осуществление покупателем предпринимательской деятельности на данном объекте, создание им дополнительных рабочих мест;

– запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объектов до выполнения им условий договора купли-продажи;

– заключение победителем аукциона с горисполкомом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения горисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок.

по Лоту № 2:

– осуществление покупателем предпринимательской деятельности на данном объекте, создание им дополнительных рабочих мест;

– запрещение покупателю продажи, иного отчуждения объектов до выполнения им условий договора купли-продажи;

– заключение победителем аукциона с Чашникским районным исполнительным комитетом договора аренды земельного участка и осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права аренды на земельный участок, получение право удостоверяющих документов в Чашникском бюро Лепельского филиала РУП «Витебское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру»;

– получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет;

– осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

1. Аукцион состоится «01» сентября 2009 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38.

Для участия в аукционе приглашаются негосударственные юридические лица и индивидуальные предприниматели. Участнику необходимо подать заявление и подписать Соглашение установленной формы с фондом «Витебскоблимущество».

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также представляются: юридическими лицами Республики Беларусь – доверенность, выданная представителю юридического лица, копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица, **без нотариального засвидетельствования;** индивидуальными предпринимателями – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, **без нотариального засвидетельствования;** иностранными юридическими лицами – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский (русский) язык; представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, **последний день приема документов 31.08.2009 г. до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38, кабинет 308. **Заключительная регистрация участников 01.09.2009 с 14.00 до 14.45.** К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

2. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет № 3642903000021, в филиале ОАО «БПС-Банк» по Витебской области г. Витебск, код 150801307. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

3. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

4. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

5. **Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан:** подписать протокол аукциона; не позднее 10 дней со дня принятия решения горрайисполкома о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения горрайисполкомом), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, в сумме 3 миллиона рублей (по каждому лоту), расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка; не позднее 12 дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

6. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.

Жыллё маё

ВІЦЕБСК: КВАТЭРЫ СКУПЛЯЮЦЬ РАСІЯНЕ

Бадай з пачатку года амаль ва ўсіх рэгіёнах Беларусі назіраецца стабільная тэндэнцыя на патанненне жыллёвай нерухомасці. У сталіцы за гэты час кватэры на другасным рынку жылля рэальна патаннелі прыкладна на 40 працэнтаў. Аднак у Віцебску гэтую тэндэнцыю за апошнія два месяцы пераламалі замежныя пакупнікі жылля..

Самыя танныя кватэры ў Віцебску ўжо скупілі

У маі і пачатку лета ў Віцебску назіраўся самы моцны абвал цэнаў на кватэры на другасным рынку жылля. Паводле інфармацыі **дырэктара РУП «Дзяржаўнае агенцтва нерухомасці» г. Віцебска Уладзіміра КАБАНАВА,** яшчэ нават у чэрвені і ў першай палове ліпеня ў гэтым абласным цэнтры можна было купіць невялікую аднапакаёвую «хрушчоўку» ўсяго за 16—17 тысяч долараў. Стандартныя аднапакаёвыя кватэры ў панэльным дзевяціпавярховым доме, у тым ліку і ў прэстыжных раёнах горада, каштавалі тады да 25 тысяч долараў. Сёння такіх мінімальных цэнаў на кватэры ўжо не існуе.

Цяпер маленькія «хрушчоўкі» з кухняй каля 6 «квадратаў» прадаюцца ўжо да 20—23 тысячы долараў. Аднапакаёвыя кватэры з палепшанай планіроўкай, дзе каля 18 квадратных метраў прыпадае на жылы пакой і 9 кв. метраў кухня, прапануюцца на рынку і набываюцца (!) прыкладна за 29—32 тысячы долараў.

Даволі таннымі яшчэ месяц таму былі ў Віцебску двухпакаёвыя кватэры. Невялікія «хрушчоўкі» тады набываліся за 23—25 тысяч долараў. Стандартныя двухпакаёўкі ў дзевяціпавярховых панэльных дамах купляліся за 30—32 тысячы. Цяпер «двушкі-хрушчоўкі» выстаўляюцца на продаж не танней чым за 25—30 тысяч долараў, а больш прасторныя двухпакаёвыя кватэры з сучаснай планіроўкай прапаноўваюцца ўжо за 36—40 тысяч долараў.

Уладзімір Кабанаў лічыць, што цэннікі на кватэры ў пачатку лета так істотна абваліліся толькі дзякуючы псіхалагічнаму фактару. Тады сярод прадаўцоў пачала гуляць пагалоска аб тым, што да восені жыллёвая нерухомасць стане каштаваць увогуле капейкі. Уладальнікі лішніх кватэр пачалі моцна нервавацца і сталі актыўна «скідваць» жыллё нават па мінімальным кошце.

Рынак стабілізаваўся

На ажыятаж непазбежнага моцнага патаннення клюнулі далёка не ўсе гаспадары кватэр. Істотна патаннелыя кватэры былі выкуплены і... рынак стабілізаваўся. Нельга казаць, што цяпер аднапакаёвыя і двухпакаёвыя кватэры зноў падаражэлі, не... Проста на другасным рынку жылля Віцебска ўжо не з'яўляюцца вельмі танныя кватэры. Штучны ажыятаж на рынку амаль ніякім бокам не зачапіў цэннікі шматпакаёвых кватэр. Попыт на іх ужо на працягу 8 месяцаў застаецца мінімальным. Трохпакаёвыя «хрушчоўкі», пасля істотнага патаннення, і цяпер каштуюць каля 45—50 тысяч долараў. Больш прывабныя трохпакаёвыя кватэры каштуюць недзе да 60 тысяч долараў.

Расіяне набываюць кватэры на агульных падставах

Кіраўнік дзяржаўнага прадпрыемства па аказанні рыэлтарскіх паслуг г. Віцебска адзначыў, што гэтым летам жыллём у абласным цэнтры пачалі актыўна цікавіцца жыхары Расіі, Украіны і іншых краін СНД. Аднак рэальна больш масава кватэры пачалі купляць менавіта расіяне, якія маюць магчымасць набываць жыллё ва ўласнасць без нейкіх дадатковых праблем, на аднолькавых умовах з грамадзянамі Беларусі. Украінцам для ажыццяўлення здзелкі куплі-продажу жылля ў нашай краіне трэба абавязкова мець пасведчанне на права жыхарства і пастаянную працу. У гэтым выпадку ўкраінцы ці іншыя замежнікі купляюць кватэры ў абласным цэнтры на імя сваіх свайкоў, якія жывуць у Беларусі.

Паводле меркаванняў Уладзіміра Кабанава, кватэры ў Віцебску набываюцца замежнікамі амаль заўсёды дзеля таго, каб пераязджаць сюды назаўсёды жыць і працаваць. Суседзяў прыцягвае ў нашай краіне не стабільная палітычная сітуацыя, сацыяльныя гарантыі і... адсутнасць крымінału ў сферы сярэдняга і буйнога бізнэсу. Кватэры для жыхарства ў Віцебску набываюць ураджэнцы з Піцера, Масквы і Падмаскоўя, Яраслаўля і іншых буйных гарадоў Расіі.

Пасля патаннення аднавіўся попыт на невялікія катэджы

Яшчэ летась цэны на сярэднія па якасці катэджы зашкальвалі мяжу з 200—300 тысяч долараў. Шыкоўныя двух- ці трохпавярховыя дамкі эліткласа прапаноўваліся па кошце нават да 400—500 тысяч долараў. Сёння сярэднія па плошчы катэджы (100—150 кв. м) каштуюць усяго (!?) каля 80—150 тысяч долараў. Менавіта на такі клас катэджаў цяпер аднавіўся попыт сярод жыхароў Віцебска. Людзі з нядрэннымі заробкамі ўсё часцей сталі прадаваць свае элітныя шматпакаёвыя кватэры, каб потым крыху дакласці грошай і купіць катэдж. Праўда, сапраўды якасныя, а таму і дарагія кватэры цяпер прадаюцца слаба... Такое жыллё сёння працягвае таннець, а потым... яго набываюць расіяне.

Якой будзе тэндэнцыя па змяненні цэннікаў на нерухомасць? Уладзімір Кабанаў лічыць, што да зімы стандартныя кватэры ў панэльных дамах даражэць не будуць. Невялікае патанненне на такое жыллё будзе крочыць побач са стабілізацыяй. Як толькі сусветная эканоміка пачне па-сапраўднаму ажывацца, то і ў нашай краіне можа змяніцца крэдытная палітыка банкаў, якая датычыцца фінансавання буйных здзелак з нерухомасцю. А ў гэтым выпадку адразу пачне даражаць і жыллёвая нерухомасць. Кіраўнік агенцтва ўпэўнены, што сёння той самы час, калі было б нядрэнным укладваць лішнія буйныя грошы ў патаннелую жыллёвую нерухомасць. Прадаваць кватэры цяпер можна толькі ў тым выпадку, калі паралельна набываецца іншае жыллё.

БРЭСТ: КАТЭДЖЫ РЭЗКА ТАННЕЮЦЬ

Удакрызісны час менавіта ў заходнім фарпосце — Брэсце — жыллёвая нерухомасць карысталася стабільным попытам. Цэны на кватэры тут займалі выключна другое месца, пасля сталіцы. Цяпер усе віды кватэр на другасным рынку жылля абласнога цэнтра патаннелі за апошнія 8 месяцаў ажно на 30—50 працэнтаў...

Попыт на другасным рынку— амаль нулявы

Паводле інфармацыі **дырэктара дзяржаўнага агенцтва па аказанні рыэлтарскіх паслуг г. Брэста Анатоля ВАЙТОВІЧА,** сёння ў горадзе над Бугам назіраецца мінімальны попыт на жыллёвую нерухомасць. Разам з тым, цяпер у горадзе існуе самая вялікая за апошнія 10 гадоў прапанова невялікіх па плошчы аднапакаёвых і двухпакаёвых кватэр. Так, самыя нізкія па класе маласямейкі каштуюць цяпер ад 20 да 25 тысяч долараў, невялікія «хрушчоўкі» — 25—26 тысяч, а стандартныя аднапакаёвыя кватэры ў адносна новых дзевяціпавярховых дамах ацэньваюцца ў межах ад 28 да 32 тысяч долараў.

«Каб разлічвацца з вельмі дарагімі валютнымі крэдытамі, кватэры пачалі прадаваць і маладыя сем'і, якія потым вяртаюцца жыць да бацькоў».

Двухпакаёвыя «хрушчоўкі» ў пяціпавярховых дамах каштуюць ужо 34—35 тысяч, а стандартныя «двушкі» ў панэльных дамах прапануюцца за 37—43 тысячы долараў. Невялікія трохпакаёвыя «хрушчоўкі» магчыма набыць за 45—46 тысяч, а больш прасторныя кватэры з сучаснай планіроўкай і агульнай плошчай каля 58 кв. метраў каштуюць не больш як 50—52 тысячы долараў.

Чаму ў Брэсце назіраецца такое моцнае і працяглае патанненне жылля? Прычына ў тым, што ў свой час кватэры тут набываліся не толькі для пастаяннага пражывання, але і ў якасці своеасаблівых перавалачных базаў для захоўвання невялікіх партый тавару, які паступаў з Польшчы. У брэсцкія кватэры ўкладвалі грошы багатыя прадпрымальнікі і прадстаўнікі дробнага і сярэдняга бізнэсу. Набываліся тады кватэры і мясцовымі жыхарамі па завышаным цэнніку, дзеля чаго ў банках браліся вялікія валютныя крэдыты. Як вядома, пасля новага года валютныя крэдыты сталі вельмі дарагімі, а кватэры, наадварот, пачалі таннець.

Пад уздзеяннем гэтых фактараў сёння вялікая колькасць лішніх кватэр прапануецца на продаж. Прадаўцы згодныя ісці на зніжкі ў памеры 2—3,5 тысячы долараў. Кватэры пачалі прадаваць і маладыя сем'і, каб разлічыцца з вельмі дарагімі валютнымі крэдытамі. А вось самі яны вяртаюцца жыць да бацькоў.

Аднак, як адзначае Анатоль Вайтовіч, істотнае зніжэнне цэнаў назіраецца не па ўсім спектры кватэр. Прыкладна 60—70 працэнтаў уладальнікаў жылых памяшканняў працягваюць трымаць амаль леташнія цэны на жыллё. Па сутнасці, гэта частка мёртвага рынку, калі гаспадары кватэр спадзяюцца ці на нейкі цуд, ці на багатага дзядзьку з Кіева...

Будаваць пакуль больш выгадна

Лепш за ўсё вырашаць сваё жыллёвае пытанне шляхам будаўніцтва новага жылля з выкарыстаннем ільготных крэдытаў па дзяржаўных цэнах. Аднак у Брэсце існуе даволі вялікая чарга на такім будаўніцтве. Таму ў горадзе актыўна дзейнічае сістэма долевага будаўніцтва, якой могуць скарыстацца не толькі бескватэрныя жыхары, але і нечаргавікі. Па лініі долевага будаўніцтва квадратны метр жылля ў панэльных дамах каштуе прыкладна 2,1—2,2 млн рублёў, у цагляных дамах жыллёвы квадрат дасягае 2,3—2,8 млн рублёў. Заўважу, што кошт квадратнага метра агульнай плошчы кватэр на другасным рынку жылля рэальна складае ў Брэсце каля 800 долараў. Будаўніцтва кв. метра новага жылля па «далёўцы» ў панэльным доме каштуе каля 760 долараў. Відавочна, што кватэры па долевай схеме здаюцца без апрацоўкі, але плюсам такога жылля з'яўляюцца тэхнічныя і дызайнерскія характарыстыкі новых сучасных будынкаў. А вось дарагія цагляныя дамы вялікага попыту ў Брэсце не маюць.

Асобныя катэджы патаннелі адразу на 40 тыс. USD

Яшчэ летась у жыхароў Брэста добрым попытам карысталіся аднапавярховыя, але прасторныя бунгала. Гэта звычайна 3—4 жылыя пакоі, кухня і хол. Такія дамкі без апрацоўкі каштуюць сёння ад 60 да 80 тысяч долараў. Мінулай зімой такая нерухомасць каштавала не менш як 100 тысяч долараў. Не вельмі шыкоўныя дамкі ў прыгарадзе Брэста, але абавязкова побач з рэчкай, каштуюць да 60 тысяч долараў. Такія жылыя дамы маюць усе сучасныя выгоды і стаяць на 15—20 сотках зямлі. Прыватныя дамкі з усімі камунікацыямі непасрэдна ў горадзе каштуюць сёння 55—60 тысяч долараў. За апошнія 3—5 месяцаў такая жыллёвая нерухомасць патаннела прыкладна на 20—25 тысяч долараў.

Таннець і надалей

Спецыялісты другаснага рынку нерухомасці Брэста адзначаюць, што за апошні месяц кватэры ў абласным цэнтры патаннелі яшчэ на 3—5 працэнтаў. Эксперты прагназуюць, што надалей тэмпам ад 1 да 3 працэнтаў за месяц жыллёвая нерухомасць будзе плаўна таннець мінімум да пачатку новага года.

Сяргей КУРКАЧ.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.46	20.42	14.56
Віцебск —	5.31	20.36	15.05
Магілёў —	5.36	20.32	14.56
Гомель —	5.37	20.24	14.47
Брэст —	6.02	20.56	14.54
Гродна —	6.07	21.52	14.45

Месяц

Апошняя квадра 13 жніўня. Месяц у сузор'і Блізнятаў.

Імяніны

Пр. *ПЕРШЫ СПАС (Макавей), Аляксандра, Дзмітрыя.*

К. *Сільвіі, Яўсея.*

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.



Погляд

КАРТА ПАЛЯКА: хто маўчыць, а хто і крычыць

Уцывілізаваным грамадстве хадзіць у чужы манастыр са сваім статутам лічыцца маветонам з сівога сярэднявечча. На жаль, палітыкі нават той самай цывілізаванай часткі старой Еўропы часта забываюцца на элементарныя правілы прыстойных паводзінаў, каб дагадзіць пэўным інтарэсам. Так адбылося і з законам аб карце паляка. Дэпутаты Сейма невядома з якога перапалоху раптоўна загарэліся братняй любоўю да суайчыннікаў, якія пражываюць у 15 самастойных дзяржавах на усход ад самой Польшчы. Згодна з на хуткую руку прынятым законам, ім у замен здавалася б абсалютнай драбязы — абяцанне не дзейнічаць супраць інтарэсаў Польшчы — прапануецца шэраг прыемных ільгот: ад шматразовай візы і зніжак на праезд да магчымасці весці бізнэс. Чаму суайчыннікаў, якія жывуць на Захадзе, польскія парламентарыі любяць менш, не паведамляецца. Не ўдастоіліся ласкі і астатнія жыхары Еўрасаюза, у чым тамтэйшыя праваабаронцы таксама заўважылі пэўную дыскрымінацыю. Не без яе. Па сутнасці, усе грамадзяне тых дзяржаў, дзе распаўсюджваецца карта паляка, з Варшавы падзяляюцца на два сарты: палякі і ўсе астатнія. Гэта значыць, па этнічнай прыкмеце. Вельмі цікава, наколькі гэта адпавядае дэмакратычным прынцыпам.

Натуральна, МЗС Беларусі, жыхары якой пра нацыянальныя канфлікты і напружанасць ведаюць толькі з міжнароднай панарамы па ТБ, звярнула ўвагу польскіх калег на, мякка кажучы, недапрацаванасць закона, яго неадпаведнасць міжнароднаму праву. Маўляў, у такой рэдакцыі дакумент можа сур'ёзна дэстабілізаваць міжнацыянальныя адносіны ў краіне, выклікаць напружанасць у грамадстве, парушыць яго стабільнасць і выклікаць недавер паміж беларускімі грамадзянамі розных нацыянальнасцяў. Дзіўна было ў адказ на справядлівыя заўвагі чуць абвінавачанні ў «нецывілізаванасці» і спробах раздзьмуць з мухі слана. Маўляў, усіх, акрамя вас, варшаўская ініцыятыва цалкам задавальняе і нікольні не насцярожвае. Аднак, як высветлілася, гэта не зусім так. Узяць хоць тую Прыбалтыку, хоць Украіну.

Калі Беларусь усімі сіламі намагалася палюбоўна ўрэгуляваць пытанне і неаднаразова запрашала польскі бок за стол перамоваў, то ў суседняй Літве разгарэўся сапраўдны скандал. Сапраўды, калі іншая дзяржава па сродках былых суайчыннікаў атрымлівае магчымасць уплываць на рашэнні парламента — а значыць прыняцце тых ці іншых законаў — тут ужо не да славутай еўрапейскай паліткарэктнасці...

Справа ў тым, што двое з трох палякаў, якія прайшлі ў літоўскі сейм па партыйных спісах «Літоўскай выбарчай акцыі», маюць сумнавядомыя карты палякаў. Іх калега хрысціянскі дэмакрат Гінтарас Сангайла ўгледзеў у гэтым «прыняцце абавязацельстваў адразу перад дзвюма дзяржавамі». Сангайла ўказвае на 19-ы артыкул карты паляка, дзе ясна сказана, што асоба, якая яе набывае, абавязваецца быць лаяльнай інтарэсам Польскай Рэспублікі. «Акрамя таго, атрыманне карты паляка звязваецца з абаронай Рэспублікі Польшча, яе бяспекай, грамадскім парадкам, ненанясеннем урону асноўным інтарэсам Польшчы», — дадаў ён.

Карта паляка з'яўляецца міні-квазіграмадзянствам і накладвае на яе ўладальніка пэўныя абавязкі і на думку прадстаўніка кансерватараў, члена дзяржаўнай выбарчай камісіі Літвы Гінтараса Калінаўскаса. Вось што ён заявіў з гэтай нагоды: «Асоба, якая хоча атрымаць карту паляка, прадстаўляе пісьмовую дэкларацыю, у якой даказвае сваю прыналежнасць да польскай нацыянальнасці. А страчвае права на карту, калі дзейнічае супраць інтарэсаў польскай дзяржавы. Падкрэслю, не супраць народнасці, а супраць дзяржавы. Схіляю галаву перад польскімі заканатворцамі...».

Цяпер па просьбе спікера сейма парламенцкія юрысты аналізуюць статус, які прадастаўляе «карта». Восенню парламент вернецца да гэтага пытання і будзе вырашаць, ці перадаваць яго ў Канстытуцыйны суд. Пакуль жа, нагадаем, на мінулай сесіі парламент Літвы ў першым чытанні прыняў праект закона аб накіраванні ў КС пытання аб тым, што насамрэч на практыцы азначае палажэнне Канстытуцыі аб тым, што дэпутат не можа быць звязаны клятвай і абавязацельствам з іншай дзяржавай. У законапраекце не гаворыцца пра карту паляка, аднак ніхто не сумняваецца, што пытанне датычыцца двух дэпутатаў, якія яе маюць.

Бачаць пэўныя пагрозы для сябе ў законе аб карце паляка і ва Украіне. Прэтэндэнтаў ва «ўсходнія палякі» там таксама нямала: да 1939 года грамадзянамі Польшчы былі практычна ўсе карэнныя жыхары Заходняй Украіны. Карта паляка многімі іх нашчадкамі разглядаецца як пропуск не толькі ў Польшчу, але і ў ЕС. Такім чынам, у заходнім рэгіёне дзяржавы ў хуткім часе можа ўтварыцца анклаў, інтарэсы жыхароў якога скіраваныя ў большай ступені на Польшчу, чым на Украіну. На форумах у інтэрнэце і на старонках некаторых украінскіх СМІ абсалютна сур'ёзна і даволі актыўна абмяркоўваецца пытанне, ці не ператворацца ўладальнікі карты паляка ў своеасаблівую «пятую калону», агентуру ўплыву суседняй дзяржавы на развіццё падзей ва Украіне? Выказваюцца думкі і геапалітычнага маштабу. Маўляў, ці не паспрабуе польскі бок пры магчымым змяненні сітуацыі ва Украіне скарыстацца «картай» для рэвізіі палітычнай карты Усходняй Еўропы?

Калі разабрацца, не такая ўжо і лухта. У польскім грамадстве даволі шырока прадстаўлены сілы, якія спяць і бачаць «Вялікую Польшчу» ў межах калі і не «ад можа да можа», дык хоць 1939 года. Натуральна, пра перагляд межаў ваенным шляхам у сучаснай Еўропе размовы весціся не можа, але, як паказвае прыклад таго ж Косава, можна беспакарана адарваць кавалак тэрыторыі суверэннай дзяржавы псеўдалегітымным шляхам — напрыклад, правесці рэферэндум.

